Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нумыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам — не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрэсу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок калярорні пасьля тэксту — р. 50 к. За радок калярорні наперад тэксту 1 р. — к. За радок калярорні перад тэкстам 1 р. 50 к. Складаныя ня 50 проц. дарожэй. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. надбуду.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесспрадоўн. і чырвонаармейцам за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. лінія

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. аддзелах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 248 (2737) Аўторак, 29-га кастрычніка 1929 г.

Як сьвяткаваць 12 гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б.

1. Сьвяткаваньне XII-й гадавіны Кастрычнікай Рэвалюцыі павінна праходзіць пад знакам: а) асьвятленьня нашых посьпехаў па выкананьню 5-ці гадовага плану сацыялістычнага будаўніцтва за першы год пяцігодкі, як у галіне індустрыялізацыі краіны, гэтак і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, росту рабочае клясы і посьпяховаму пераходу на 7-мі гадзінны працоўны дзень; б) падагульваньня вынікаў творчага энтузіязму працоўных пры шырокім скарыстаньні ўсіх магчымасьцяй выкананьня пяцігодкі ў скарочаны тэрмін (соцыялістычнае спаборніцтва, бесперапынны тыдзень, масавая калектывізацыя, чырвоныя абозы, дзень індустрыялізацыі і г. д.); в) перамогі цяжкасьцяй, якія вынікаюць з напружаных тэмпаў будаўніцтва і абвастрэньне клясавай барацьбы, як выніку нашага рашучага наступу на капіталістычныя элементу гораду і вёскі; г) пад знакам яшчэ большага замацаваньня непарушнага саюзу пролетарыяту з асноўнымі масамі сялянства пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

2. Усебакова высьвятліць кіруючую ролю пралетарыяту і яго комуністычнай партыі ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, падкрэсьліць небясьпеку ўхілу ад генэральнай лініі партыі і неабходнасьць рашучай барацьбы ў першую чаргу з правай опозыцыяй, а таксама „левымі" загібамі і прымірэнцтвам да ўсіх скрыўленьняў лініі партыі.

3. Паказаць посьпехі культурнага будаўніцтва, асобна падкрэсьліць вялікае значэньне барацьбы на ідэалёгічным фронце за пролетарскі зьмест культуры, за культурны ўздым шырокіх колаў працоўных, за тэмп культурнага будаўніцтва, які павінен адпавядаць тэмпу гаспадарчага будаўніцтва. Ва ўсёй раслумачальнай працы асабліва падкрэсьліць тое, што БССР толькі ў Саюзе Савецкіх Рэспублік мае магчымасьць палітычнага, эканамічнага і культурнага разьвіцьця, падкрэсьліць дапамогу Саюзнага ўраду БССР.

4. Падкрэсьліць, як цэнтральную праблему, пытаньне аб кадрах. Папулярызаваць пастанову верасеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб рашучым вылучэньні і падрыхтоўцы новых пролетарскіх кадраў.

5. Выходзячы з дырэктывы Пленуму, асабліва падкрэсьліць пытаньне аб шырокім разгортваньні масавай самакрытыкі, аб папярэджваньні шляхам разгортваньня самакрытыкі скажэньняў клясавай лініі ў рабоце і своечасовым выпраўленьні гэтых скажэньняў, не пасмяльваючы рашучай барацьбы з бюрократызмам.

6. Супроцьпаставіць з аднаго боку нашу перамогу на фронце соцыялістычнай рэканструкцыі і рэвалюцыйны ўздым працоўных у капіталістычных краінах і з другога боку расшатваньне капіталістычнай стабілізацыі, рост небясьпекі ўзброенага нападу на СССР, правацыя кітайскіх мілітарыстых і небясьпекі новых імпэрыялістычных войн наогул. Падкрэсьліць контр-рэвалюцыйную ролю соцыял і нацыянал-фашыстых, якія непасрэдна рыхтуюць вайну супроць СССР.

7. Сьвяткаваньне павінна яшчэ больш завастрыць увагу на пытаньнях абароны Савецкага Саюзу, большай сувязі працоўных з Чырвонай арміяй, як узброеным атрадам сусьветнай рэвалюцыі і ўвагі да яе.

8. З асаблівай сілай падкрэсьліць сапраўдную ролю нацыянал-дэмократызму ў нас, як дапаможнікаў нацыянал-фашызму ў Польшчы і Заходняй Беларусі. Бо на справе афарбленьня нацыянал-фашызму ў Заходняй Беларусі, які зьяўляючыся політычным выразьнікам інтарэсаў беларускай буржуазіі, кулацтва і буржуазнай інтэлігенцыі, уваходзіць сустаўной частакаю ў антысавецкі, імпэрыялістычны, контр-рэвалюцыйны лягер і выконвае планы польскага фашызму, стымулюе атакі беларускіх нацыянал-дэмократаў у Савецкай Беларусі; таксама як вылазкі нацыянал-дэмократаў у нас, якія зьяўляюцца ідэалёгамі кулака і нэпмана, акрываюць нацыянал-фашыстых у Заходняй Беларусі.

9. Падкрэсьліць неабходнасьць узмацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас, завастрыць увагу на барацьбе з антысэмітызмам, усімі шовінізмамі і асабліва на даным этапе з правамі беларускага нацыянал-дэмократызму.

10. Сьвяткаваньне XII-е гадавіны Кастрычніка павінна зьвіцца яшчэ больш моцным штуршком да поўнага выкананьня пляну хлебазагатовак—загатовак бульбы для забясьпячэньня ў першую чаргу рабочых цэнтраў—Масквы і Ленінграду.

Мы жадаем міру, але павінны рыхтавацца да вайны.

Гутарка старшыні ЦВК БССР тав. Чарвякова з чырвонаармейцамі-адпускнікамі. 26-X—1929 году.

Перш за ўсё прачытаю два лісты, якія ў апошні час атрымаў з вёскі. Гэтыя лісты пакажуць, якія пытаньні ў сучасны момант стаяць востра на вёсцы.

Вось першы ліст. Ён атрыман з Бабруйскай акругі. У гэтым лісьце ад імя Кулакоўскага сельскараўскага гуртка таварышы пішуць наступнае:

«У перыяд культурнага сацыялістычнага будаўніцтва кулакі і іх падпявалы ўсімі сіламі імкнуцца перашкодзіць бяднацка-серадняцкім масам ісьці па свайму новаму шляху. Апроч выступленьняў і агітацыі супроць інтарэсаў беднаты, яны распаўсюджваюць чуткі, якія шкодзяць і вельмі шкодна адбіваюцца на...»

Далей гэтыя таварышы пішуць аб тым, што нам трэба арганізавацца дзеля таго, каб даць адпор гэтым кулацкім хітрыкам, якімі яны імкнуцца зьбіць з толку бяднацка-серадняцкія масы вёскі.

У ЦВК БССР прысланы ліст аб тым, што нібы то ў газэтах усе добра пішуць, а на справе ўсё ня так, што нібы-то падпіска на пазыку праходзіць пад прымусам.

А вось і варожы голас з вёскі.

Гэта яскравы паказальнік контр-рэвалюцыйных настроіў з боку варожых нам элементаў, з боку нэпмана, альбо абкладзенага індывідуальна кулака, альбо вычышчанага з савецкай установы контр-рэвалюцыянэра.

Вось з гэтымі настроямі вам прыдзецца сустрэцца на вёсцы, калі вы туды прыедзеце. Вас аб шмат чым запытаюць, вы шмат чаго пабачыце. Вы пачуеце і пра вайсковую небясьпеку. Як вы на гэта адкажаце.

Першае, што сказаць нашым бацьком аб вайсковай небясьпецы.

Бачыце, кулакі распаўсюджваюць чуткі аб тым, што хутка будзе вайна, што яна скончыцца перамогаю капіталістаў на Беларусі—перамогаю польскіх паноў якія прыдуць сюды і камуністаў комсамольцаў перавешаюць, сямлю адбяруць, калгасы разгоняць і г. д. Гэтае пытаньне аб вайне чуецца з месц вельмі часта. Мы дакладна сказаць, калі будзе вайна, ня можам. Ёсьць толы шэраг такіх адзнак, на падставе якіх мы гаворым, што вайна няўхільна наспяваецца, сутычка паміж капіталістычным сьветам і савецкімі рэспублікамі няўхільна адбудзецца. Мы бачым, як капіталістычны сьвет шалёна рыхтуецца да вайны супроць саюзу саветаў. І адсюль мы робім вынік, што нам таксама трэба падрыхтавацца як мага лепш, каб з гэтай барацьбы выйсьці пераможнікамі.

Але калі-б мы паддаваліся настроям, мы ўжо ў сучасны момант стаялі-б перад вайной.

Падзеі на Кітайска-Усходняй чыгунцы—гэта ёсьць правакацыя новай вайны з боку капіталістычнага сьвету. Але Савецкі Саюз прымае ўсе крокі для таго, каб гэтай вайны ня было.

Такая-ж самая небясьпека, якая ёсьць на Ўсходзе, існуе і на Захадзе. Тут такім небясьпечным фактарам вайны зьяўляецца імпэрыялістычная Польшча.

Нядаўна пры абгаварэньні пытаньня аб зьмене Польскай Канстытуцыі прэм'ер міністр Сьвітальскі выказаўся так: што „нам трэба зьмяніць сваю канстытуцыю такім парадкам, каб Польшча была-б моцнай ня толькі ва ўмовах міру, а таксама на выпадак вайны". Аб якой вайне ён тут думае? Ён думае аб вайне супроць Савецкага Саюзу і фактычна тая зьмена канстытуцыі, якую Польшча ў сучасны момант хоча сабе правесьці, мае сваёю мэтаю далейшую падрыхтоўку вайны з Савецкім Саюзам.

Таму, „даеш вайну"—вось які лёзунг існуе ў пэўных вайсковых колах Польшчы. Зразумела, што тут Савецкі Саюз прымае ўсе крокі, каб выкрыць гэту правакацыю вайны, каб папярэдзіць магчымасьць гэтай вайны.

Кулакі і другія ворагі савецкай улады стараюцца распаўсюдзіць думку аб тым, што капіталісты і Польшча ў прыватнасьці перамогуць Чырвоную армію. Такія чуткі ёсьць злосны паклёп на нашу Чырвоную армію і распаўсюджваюцца яны для таго, каб застрашыць працоўных гораду і вёскі.

Адсюль я знаходжу адказ на першае ваша запытаньне: што сказаць бацьком аб вайне. Што вайна з капіталістычным сьветам будзе, што Савецкі Саюз прымае ўсе крокі для таго, каб папярэдзіць гэтую магчымасьць вайны, але ў зьвязку з тым, што гэта вайна будзе, нам трэба ўсім рыхтавацца да гэтай вайны. Мы пераможам, калі ўсе будзем падрыхтаваны да гэтай вайны.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра правядзеньне перавыбараў саветаў і раённых зьездаў Саветаў БССР у 1930 г.

1. Правесьці ў 1930 годзе справаздачную і перавыбарчую кампанію сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў і раённых зьездаў саветаў, своечасова распачаўшы падрыхтоўку да перавыбарчае кампаніі.

2. Справаздачную і перавыбарчую кампанію саветаў правесьці з 16-га студзеня па 1-е сакавіка 1930 году ў наступныя тэрміны:

а) сельскіх і местачковых саветаў — з 15-га студзеня па 15 лютага 1930 году;

б) гарадзкіх саветаў—з 1-га лютага на 1-е сакавіка 1930 году.

3. Раённыя зьезды саветаў правесьці ў сакавіку м-цы 1930 году.

4. Даручыць Цэнтральнай Выбарчай Камісіі падрыхтаваць і падаць на бліжэйшае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК праекты дырэктыў акруговым выканаўчым камітэтам і неабходных мерапрыемстваў у зьвязку з правядзеньнем справаздачнай і перавыбарчай кампаніі саветаў і раённых зьездаў саветаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

27 кастрычніка 1929 г. г. Менск.

УРАДАВЫ КРЫЗІС У ФРАНЦЫІ.

САЦЫЯЛІСТЫ СА ЗДАВОЛЕНЬНЕМ ІДУЦЬ У НОВЫ БУРЖУАЗНЫ ЎРАД.

Перамога камуністаў.

На муніцыпальных выбарах Парыжу ў раёне Гар Марты атрымаў большасьць галасоў.

ПАРЫЖ, 27-X. Сёньня ў другім туры дадатковых муніцыпальных выбараў у Гар (раён Парыжу) канчаткова перамагла кампартыя. Марты атрымаў 4907 галасоў супроць 4033, пададзеных за кандыдата буржуазных партый Кюсака. Паведамленьне аб выніках выбараў з уздымам спаткана рабочымі раёну. Адбылася стыхійная дэманстрацыя, у якой узяло ўдзел каля 4 тысяч чалавек.

Адозва Андрэ Марты да сваіх выбаршчыкаў.

ПАРЫЖ, 26-X. Андрэ Марты агалосіў адозву да сваіх выбаршчыкаў у рабочым раёне Парыжу Гар. У сваім лісьце Марты зазначае на немэтазгоднасьць спроб буржуазеі даць выхад узрастаючаму нездаволеньню працоўных праз прыцягненьня да ўраду левага-буржуазных партый.

Водгук слоў Марты, гэтае нездаволеньне, пад кіраўніцтвам кампартыі, пойдзе шляхамі клясавай барацьбы в клясавымі ворагамі, будзь гэта прадпрыемцы на заводзе, хлебныя спекулянты, біржавікі ці сацыял-фашысты.

Брыян згадзіўся ўвайсьці ў новы ўрад.

ПАРЫЖ, 27-X. Гавас паведамляе: „Далад'е заявіў, што Брыян згадзіўся ўвайсьці ва ўрад. У кулуарах палаты дэпутатаў зьвяраюць, што Далад'е займае пасаду прэм'ера і міністра ўнутраных спраў і запрапануе партфэль вайсковага міністра сацыяліста Бонкуру".

Сацыялісты рады старацца...

ПАРЫЖ, 27-X. Гавас паведамляе: «Сацыялістычная фракцыя палаты большасьцю 36 галасоў супроць 12 ухваліла прыняць удзел ва ўрадзе».

За адзінства шэрагаў Камінтэрну.

Швэдзкая кампартыя выключыла з партыі групу правых апартуністаў.

СТАКГОЛЬМ, 25-X. Палітбюро швэдзкай кампартыі выключыла з партыі Флюга, Чыльбума, Самуэльсона, Эйнара Ульсона, Арвіда Ульсона, Югансона, Мальмроза, Сопбэрга (дэпутат), Адамсона (рэдактар партыйнай газэты ў Гетэборзе) і Ляндэна (рэдактар газэты „Гарлянде Кур'ір" у г. Сунсваль).

Усе гэтыя асобы выключаны за прадоўжаньне кампаніі супроць партыі і Камінтэрну і за адмову аддаць парляманцкія мандаты. Палітбюро адзначае, што сваімі паводзінамі гэтыя асобы паказалі, што мэта іх—заснаваньне левай сацыял-фашысцкай партыі.

Латвія—за добрасуседзкія адносіны з СССР.

Заява латвійскага паслаўніка СССР карэспандэнту ТАСС

МАСКВА, 26-X. Новы латвійскі надзвычайны пасланьнік і паўнамоцны міністр у СССР пан Сэскіс, які прыехаў гэтымі днямі ў Маскву, у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС гэтак ахарактарызаваў палітычныя, эканамічныя і культурныя ўзаемадносіны між Савецкім Саюзам і Латвіяй.

„Замежная палітыка Латвіі, як і СССР,—сказаў Сэскіс,—шчыра імкнецца да захаваньня міру і нічым не заплямленых добрасуседзкіх адносін. Лепшым доказам такіх імкненьняў абодвых урадаў зьяўляецца супольнае падпісаньне маскоўскага пратаколу ад 9-га лютага 1929 году. Аднак, у сувязі са зьмяшчэньнем часам у друку паведамленьняў аб стварэньні антысавецкіх блёкаў і аб магчымым удзеле ў іх Латвіі, я карыстаюся гэтым выпадкам для катэгарычнай заявы, што майму ўраду абсалютна чужыя ўсякія ідэі аб удзеле ў палітычных групоўках з агрэсыўна-варожымі мэтамі ў адносінах да Саюзу ССР".

Да XII гадавіны Кастрычніка.

Прыблізна праз дзесяць дзён пралетарыі СССР і пралетарыі ўсяго сьвету будуць сьвяткаваць XII гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі. Дванаццатая гадавіна пераможнага Кастрычніка супадае в першай пераможнай гадавінай нашай сацыялістычнай пяцігодкі. Гэтыя дзьве пераможныя гадавіны зьяўляюцца сьведкамі вялічэзнага пралетарскага наступу на капіталізм.

Кожная з гэтых гадавін дапаўняе другую; **калі Кастрычнікавая рэвалюцыя зьяўляецца падвалінай для пасьпяховага выкананьня нашай пяцігодкі, дык і выкананьне апошняй зьявіцца вялікім крокам да пашырэньня і замацаваньня заваёў Кастрычніка.**

Таму галоўнымі момантамі, пад якімі павінна прайсьці сьвяткаваньне XII гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, будуць лёзунгі пралетарскай перамогі, будуць лёзунгі сацыялістычнага наступу на рэшткі капіталізму ў СССР, будуць лёзунгі мабілізацыі пралетарскіх сіл сьвету да канчатковага пераможнага паходу на ўсесьветны капіталізм.

Вынікі першага году пяцігодкі паказваюць творчую ініцыятыву пралетарыяў, якія праз сацыялістычнае спаборніцтва, праз прыцягненьне мілітаў да сацыялістычнай пабудовы перавысілі кантрольныя лічбы першага году пяцігодкі і паставілі пытаньне аб выкананьні пяцігодкі ў чатыры гады. Праведзены дзень індустрыялізацыі ў горадзе і дзень калектывізацыі на вёсцы ясна пасунулі наперад нашае сацыялістычнае будаўніцтва.

Гэты творчы парыў мас паказаў наколькі безпадстаўнымі былі ўсе крыкі, увесь лямант правых ыцікаў аб немагчымасьці выканаць высокія тэмпы індустрыялізацыі, якія былі намечаны нашай партыяй.

Мінулы гаспадарчы—1-ы гадзіцелетні быў годам вялікага пералому ва ўсей рабоце. Ня гледзячы на вялікія цяжкасьці, у сурёзна абвостраным капіталістычным абкружэньні, у абставінах клясавае барацьбы ў горадзе і асабліва ў вёсцы рабочыя і батракі, бяднацкія і серадняцкія масы зрабілі значныя крокі наперад у галіне пабудовы сацыялізму. Дзесяткі і сотні новых фабрык і заводаў, сотні і тысячы новых калгасаў і савгасаў, сотні тысяч новых гэктараў аграмаджанай зямлі. Павялічыўся выпуск новых тысяч трактараў, машын, узмацнілася пабудова дзесяткаў электрычных станцый, на сотні тысяч пудоў павялічылася ўраджайнасьць нашых палёў. Так у нашай краіне практычна ажыцьцяўляецца лёзунг партыі—«дагнаць і перагнаць» з высокай тэхнікай капіталістычныя краіны.

У дні сьвяткаваньня XII гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ўвага рабочае клясы і бяднацка-серадняцкае часткі вёскі павінна быць мабілізавана навакол далейшых задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва, навакол далейшых перамог цяжкасьцяў, навакол датэрміновага выкананьня пяцігодовага пляну гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і пераход на бесперарыўны рабочы тыдзень і 7-мі гадзінны рабочы дзень, дапамогуць разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва, дапамогуць выканаць пяцігодку да тэрміну.

У горадзе з 1-га лістапада, на вёсцы з 27-га кастрычніка ўжо пачнуцца гутаркі, даклады, лекцыі, экскурсіі, якія маюць на мэце адзначыць і асьвятліць у сувязі з XII гадзінай Кастрычніка вынікі першага году пяцігодкі і паказаць задачы на другі год пяцігадовага пляну. Ва ўсёй гэтай рапоце трэба наўхільна спыняцца на рашэньнях XV зьезду і XVI канфэрэнцыі УсеКП(б), на рашэньнях XII зьезду КП(б)Б і на верасьнёўскім пленуме ЦК КП(б)Б. Трэба перад усімі рабочымі яшчэ раз паказаць, што намецілa партыя, што ўжо праводзіцца і што павінна быць праведзена ў бліжэйшы час.

Спыняючыся на нашым росьце і дасягненьнях, на згуртаванасьці пралетарыяў гораду і бяднацкіх мас вёскі навакол камуністычнае партыі, растлумачваючы сацыялістычны характар і ўсясьветна-гістарычнае значэньне Кастрычнікавага перавароту, растлумачваючы задачы ўзмацненьня СССР, як сацыялістычнай базы пралетарыяту, як цытадэлі, навакол якой аб'яднаюцца міліённыя масы прыгнечаных усяго сьвету, трэба спыніцца і адзначыць фашысцкую сутнасьць II-га Інтэрнацыяналу, ганебнае здрадніцтва трацкістаў і правых апартуністаў, якія зрабіліся дадаткам да міжнароднай сацыял-дэмакратыі.

Трэба адзначыць і контр-рэвалюцыйную сутнасьць выступленьняў нацыянал-дэмакратаў, якія дапамагаюць нацыянал-фашыстам у Заходняй Беларусі. А нацыянал-фашызм Заходняй Беларусі і Польшчы зьяўляецца палітычным тварам беларускай буржуазеі, кулацтва і буржуазнай інтэлігенцыі. Гэты фашызм ідзе ў нагу разам з усім антысавецкім блёкам.

У дзень XII гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, мабілізуючы ўвагу пралетарыяў усяго сьвету на барацьбе з капіталізмам, на барацьбе з фашысцкай сацыял-дэмакратыяй, мабілізуючы ўвагу працоўных Заходняй Беларусі на барацьбе з беларускімі нацыянал-фашыстамі, трэба згуртаваць увагу працоўных усіх нацыянальнасьцяў як Саюзу Саветаў, так і ўсяго сьвету навакол пытаньняў узмацненьня братэрскай салідарнасьці працоўных, навакол пытаньняў інтэрнацыянальнага выхаваньня апошніх.

Як прапаганда, так і сама работа па інтэрнацыянальному выхаваньню і салідарнасьці павінна праходзіць пад знакам згуртаваньня рабочае клясы і бяднацка-серадняцкіх мас навакол камуністычнае партыі, навакол яе генэральнае лініі на сацыялістычны наступ.

Дні сьвяткаваньня XII гадавіны Кастрычніка супадаюць з тым уздымам мас навакол пытаньняў загатовак. Працоўныя БССР у гэтыя дні рыхтуюць для пралетарыяў Масквы і Ленінграду новыя эшалёны бульбы. Гэтыя эшалёны гаворыць ня толькі аб абавязках беларускага бедняка і серадняка перад маскоўскім і ленінградзкім пралетарыятам, але гаворыць аб тым энтузіязьме, аб тым жаданьні беларускіх пралетарыяў дапамагчы матар'яльна, зьвязаная цясьней з пралетарыямі індустрыяльных сталіц СССР.

Дні сьвяткаваньня XII Кастрычніка не павінны заставіць з боку пралетар-

У лягеры кітайскіх мілітарыстаў.

Харбінская паліцыя арыштавала 100 савецкіх грамадзян якім не прад'яўлена абвінавачаньне.

Новыя арышты савецкіх грамадзян

Паліцыя захоўвае прозьвішчы арыштаваных.

ТОКІЁ, 27-X. Арышты савецкіх грамадзян у Харбіне прадаўжаюцца. За апошнія дні арыштавана больш 100 савецкіх грамадзян, абвінавачаных «у чырвоным тэроры». Аднак, паліцыя не агалашае ні прозьвішча арыштаваных, ні канкрэтных абвінавачаньняў супроць арыштаваных з прычыны адсутнасьці гэтых абвінавачаньняў.

Авантурны характар прыгавору па справе 37.

ТОКІЁ, 27-X. Учора засуджаным на працэсе 37 савецкім грамадзянам перададзены адбіткі судовага прыгавору з абгрунтаваньнем апошняга.

Тая частка прыгавору, якая зьмяшчае абгрунтовачны матар'ял, зьяўляецца поўнаю нечаканасьцю для падсудных і абароны. З прыгавору відаць, што 37 савецкіх грамадзян абвінавачаны ня толькі па арт. 7 (удзел у сходзе), як было зазначана ў акце абвінавачаньня, але таксама і па арт. 2 (наладжаньне мяцежу, тайная змова для пізрынуцьця сучаснага ладу і заўладаньне дзяржаўнай тэрыторыяй). Апошняе абвінавачаньне пракурора ня высоўвалася на працягу ўсяго працэсу. Абгрунтаваньне прыгавору выклікала ўсеагульнае зьдзіўленьне ў юрыдычных колах.

Як відаць, прыгавор у такой форме быў прадыктаваны суду яшчэ да пачатку працэсу, але суд і пракурор пры ўсім сваім імкненьні не маглі даказаць гэтых абвінавачаньняў на працэсе і ціпер проста перапісалі загадзя атрыманую імі форму прыгавору.

Нанкін вымушан будзе згадзіцца на патрабаваньні савецкага ўраду.

ТЭГЕРАН, 27-X. Блізкая да двара шаха газэта, абмяркоўваючы савецка-кітайскі канфлікт, лічыць, што, калі нанкінскі ўрад у выніку ўнутраных падзей ня скінецца, дык ён, ва ўсякім разе, прымушан будзе згадзіцца на патрабаваньні савецкага ўраду.

Засуджаны на 4 гады.

ТОКІЁ, 27-X. Былы начальнік тэлеграфу УК чыгункі Заціплінскі і былы начальнік тэлефону Лебедзеў засуджаны на 4 гады зьняволеньня.

Разброілі ўрадавае войска.

ШАНХАЙ, 25-X. Водгук паведамленьня агенцтва Рэйтэра, камуністычныя атрады, колькасьцю каля 5 тысяч чалавек, пад камандаю Чу-Дэ ў По-юньскім раёне правінцыі Гуандунь захапілі галоўны горад раёну і разброілі ўрадавае войска.

Забастовачны рух рабочае клясы.

ЗДРАДНІЦКАЯ ПАЛІТЫКА РЭФАРМІСТАЎ УСТУПАЕ МЕЙСЦА КІРАЎНІЦТВУ КАМУНІСТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ.

15-тысячная забастоўка салідарнасьці францускіх докераў.

ПАРЫЖ, 27-X Праведзеная ўчора пад кіраўніцтвам прафсаюзаў і кампартыі аднадзённая забастоўка салідарнасьці партовых рабочых і докераў з бастуючымі ўжо чаці месяц нанкінскімі докерамі прайшла з посьпехам. Забастоўка салідарнасьці ахапіла 15 тысяч докераў больш, як у 20 партох Францыі.

Згодна ацэнкі „Юманітэ", забастоўка дала прадпрыемцам міліённыя страты. У Марсэлі забастоўка была ўсеагульнаю; да яе далучыліся таксама рабочыя асобных прадпрыемстваў, якія да гэтага часу ня выступалі разам з унітарнымі прафсаюзамі. «Юманітэ» вітае посьпех праведзенай пад кіраўніцтвам унітарных прафсаюзаў дэманстрацыі клясавай салідарнасьці, якая не застанецца апошняй у выпадку нездаволеньня патрабаваньняў бастуючых рабочых у Панне. „Гэтая дэманстрацыя,—піша «Юманітэ»,—узмацніла баяздольнасьць докераў у іншых партох у барацьбе за ўласныя эканамічныя і палітычныя патрабаваньні". Рэфармісцкі друк ніводным словам не памінае пра выступленьне докераў.

Напярэдадні ўсеагульнай забастоўкі гарнякоў Польшчы.

ВАРШАВА, 28-X. У Катавіцах адбылася дэлегацкая канфэрэнцыя гарнякоў, на якой прысутнічала 139 прадстаўнікоў ад 71 капальні трох каменнавугольных раёнаў Польшчы.

Канфэрэнцыя аднагодна ўхваліла абвясьціць 5-га лістапада ўсеагульную забастоўку гарнякоў, калі ўласьнікі капальняў не здавіліць да гэтага часу эканамічных патрабаваньняў рабочых.

У ПОЛЬШЧЫ.

Мітынг украінскіх сялян і рабочых

ВАРШАВА. У Саснавіцах, Валадарскага павету адбыўся, скліканы Сельробам, мітынг, на якім сабралася каля тысячы ўкраінскіх сялян і рабочых. Паліцыі не ўдалося разагнаць сялян, не зважаючы на шматразовыя спробы. У Львове адбылася скліканая аб'яднаным Сельробам, агульнакраявая канфэрэнцыя земляробчых рабочых і батракоў. Прыехала 29 дэлегатаў ад 16 паветаў.

Перамога левых.

ВАРШАВА, 22-X. На апошнім пасяджэньні варшаўскага прафсаюзу краўцоў выбары скончыліся перамогаю левага крыла. На мылавараным заводзе „Зіхт" выбары дэлегатаў таксама скончыліся перамогаю левых.

Гэрацкая правінцыя прызнала Надыр-хана.

ГЭРАТ, 26-X. На ўсенародным мітынгу ў Гэраце абвешчана аб падзеньні Бачэ-Сакао і аб абраньні Надыр-хана падышахам Аўганістану. У Кабул паслана тэлеграма аб прызнаньні Гэрацкай правінцыяй улады Надыр-хана.

Суд над 6 камсамолкамі.

Адна з абвінавачваемых пакончыла жыцьцё самагубствам.

НЬЮ-ЁРК, 25-X. У Сан-Францыска разглядалася справа 6 дзяўчат-камсамолак, прыцягнутых да адказнасьці за арганізацыю піанэрскага лягеру, над якім быў узьняты чырвоны сьцяг. Адна з абвінавачаных скончыла жыцьцё самагубствам яшчэ да прыгавору. Іншыя ўсе засуджаны да зьняволеньня на тэрміны ад 6 месяцаў да 5 гадоў.

Посьпехі камуністаў на выбарах у ляндтаг.

БЭРЛІН, 28-X. На выбарах у Дагенцкі ляндтаг пададзена 933 тысячы галасоў. Камуністы атрымалі 55 тысяч галасоў, сацыял-дэмакраты—187 тысяч, партыя цэнтру—342 тысячы, народная партыя—74 тысячы, нацыянал-сацыялісты (фашысты)—65 тысяч і г. д. У новым ляндтазе будзе 88 дэпутатаў. Камуністы атрымліваюць 5 мандатаў (раней—3), сацыял-дэмакраты — 18 (раней—16), партыя цэнтру—34, народная партыя—7, нацыянал-сацыялісты—6 і г. д. У параўнаньні з выбарнымі ў ляндтаг 1925 году камуністычная партыя атрымала больш галасоў і выйграла 2 мандаты „Ленінбунд", які на выбарах у рэйхстаг меў у Бадэне 4.900 галасоў, атрымаў гэты раз толькі паўтары тысячы і страціў адзіны мандат у ляндтазе, які мела ў Нямеччыне гэтая кучка ўкланістаў, выключаных з партыі.

Масавыя арышты камуністаў.

Прыналежнасьць да кампартыі абвяшчаецца „мяцежным дзеяньнем".

НЬЮ-ЁРК, 24-X. Гэтымі днямі паліцыя ўчыніла вобыск у памяшканьнях партыі ў Чыкага, прычым арыштавала 27 чалавек, у тым ліку 2 сяброў ЦК Хэтэвея і К'яра, па абвінавачаньні ў «мяцежных дзеяньнях». Гэтае абвінавачаньне абаснавана на тым, што суд першай інстанцыі абвясьціў прыналежнасьць да кампартыі „мяцежным дзеяньнем": калі гэтае рашэньне будзе падцьверджана вышэйшымі судамі штату, дык тым самым камуністычная партыя будзе прызнана ў штаце Іліноис нелегальнаю.

Ліквідавана контр-рэвалюцыйная шайка папоў і кулакоў.

ІВАНАВА - ВАЗЬНЯСЕНСК, 27-X. АДПУ ліквідавала контр-рэвалюцыйную групу папоў і кулакоў у вёсцы Галі, Кінешамскай акругі. Група праводзіла шалёную агітацыю супроць земляўпарадкаваньня, усімі спосабамі выкарыстоўваючы рэлігійныя забабоны адсталай часткі сялянства.

Па прыгавору калегіі АДПУ поп Войцін, дзячок Лазараў, кулакі Шорахаў і Шараў—расстраляны.

Расстраляны таксама два браты-кулакі Карчагіны з вёскі Малыя Пяньгі, Шуйскай акругі, якія правакацыяй і подкупам развальвалі ўзьнікаўшыя ў вёсцы калгасы, арцелі і таварыствы.

Пленум бюджэтнай камісіі ЦВК БССР.

Пленум бюджэтнай камісіі ЦВК БССР, які быў склікан на 1 лістапада, ПЕРАНОСІЦЦА НА 15 ЛІСТАПАДА Г. Г.

Сакратар бюджэтнай камісіі ЦВК БССР **А. БРУШКОЎ.**

Генэральная чыстка і праверка ячэек КП(б)Б узмацніць шэрагі камуністычнай партыі

ШЫРЭЙ САМАКРЫТЫКУ НА ПРАВЕРАЧНЫХ СХОДАХ.

Праверым свае шэрагі.

(ПАРТКАЛЕКТЫЎ КАМВУЗУ БЕЛАРУСІ).

Праверка радоў партыі парткалектыву Камвузу Беларусі імя У. І. Леніна праходзіць пры актыўным удзеле членаў партыі, рабочых і служачых КУБ. За гэты час праверана 41 тав.

У асноўным, як паказала праверка гэтай групы, парткалектыў Камвузу зьяўляецца палітычна цьвёрдым і здаровым. Але побач з гэтым знайшліся кандыдаты на чыстку. Некалькі прыкладаў: Асіповіч, член партыі з 1925 году, паходзіць з сям'і заможнай гаспадаркі, якая мае больш 15 дз. зямлі, 2 кані, кароў і інш. буйную маёмасьць. Дзядька яго займаўся гандлярствам, а ў апошні час уцёк у Польшчу. Мае сувязь з гаспадаркай і лічыцца едаком, што памяншае налог. Бацька ў калгас ня ідзе.

Цікава адзначыць, што на сходзе знайшліся абаронцы Асіповіча, як Воінаў, Пячонка і інш., але сход у сваёй большасьці даў рашучы адпор абаронцам т. Асіповіча, а таксама асудзіў апошняга.

Характэрнае пахаджэньне т. Жучко, члена партыі з 1917 г. Бацька яго быў жандарам. Сам Жучко меў некалькі партыйных спагнаньняў. Жонка яго манашка. За выканьне жонкаю рэлігійных абрадаў ён з ёю разводзіўся, але зноў сышоўся. Пры ліквідацыі Ляхаўскага райкому, дзе ён быў загадчыкам АПА, меў спагнаньне за няправільнае разьмеркаваньне партсродкаў. Браты яго ў большасьці антысавецкія элемэнты, якія выступаюць супроць беднаты і мерапрыемстваў партыі і савецкай улады.

Выступаючыя жорстка асудзілі ўсё гэта ўтоенае (аб усім гэтым калектыў нічога ня ведаў) і адзначылі, што ён яшчэ меў імкненьне найсьці туды працаваць, дзе больш можна атрымаць грошай. Побач з гэтым адноўным, Жучко мае дадатнае—ён шмат удзельнічаў у рэвалюцыйным руху і можа быць яшчэ карысным для партыі.

Вятошкін мае дом, за які атрымоўвае арэнду, у гэты-ж час атрымоўвае сямейную стыпэндыю. Мае сувязь с цесьцем кулаком. Выступаючыя адзначылі, што ён грубы, мае ўласьніцкую тэндэнцыю і ў большасьці выказваліся за выключэньне.

Тав. Воінаў, член партыі з 1924 г., меў партыйныя спагнаньні. Выступаючыя ў спрэчках адзначылі, што ён абараняў чужды элемэнт, бацька быў членам Саюзу „Русского Народа", сам высокамерен, ня вытрыманы, наглядаецца комчванства, лічыць сябе вышэй другіх. Наглядаліся насьмешкі з яго боку над яўрэямі, невыкананьне абавязкаў, ён ідзе туды працаваць, дзе больш грошай плацяць. Прыкмячаюцца мяшчанска-інтэлігенцкія выхадкі, стараецца другога пасадзіць у „галошу". За не правядзеньне пастановы ЦК ЛКСМБ аб беларусізацыі ў бытвасьці сакратаром Магілеускай АК ЛКСМБ—бюро гэтага АК было распушчана.

Тав. Каракін меў 3—4 жонкі, выключаўся з шэрагаў партыі, рабіў замах на самагубства. Выступаючыя адзначалі, што ён ня вытрыман, не дысцыплінірован, ён гаварыў: «калі-б знаў, што ня выключаць з партыі, дык зноў-бы жаніўся некалькі раз».

Тав. Бягун—член партыі з 1918 г., мае ўласную гаспадарку (5 дз.), часта езьдзіць дадому, што адбіваюцца на яго вучобе, да вучобы адносіцца нядобрасумленна, навіраюцца праявы дробна-буржуазнай ідэалёгіі, атрымлівае сямейную стыпэндыю, тады, як мае пэнсію па інвалідзнасьці і ўласную гаспадарку. Выступаючыя адзначылі, што ён добраахвотнік Чырвонай гвардыі, малапісьменны, прымаў удзел у розных бойках супроць белых, мае цяжкае раненьне, якое прывяло да інвалідзнасьці. Большасьць выказвалася за тое, каб пакінуць яго ў шэрагах партыі.

Зараз праверка працягваецца. Камісія разам з гэтым прыступіла да больш поўнага высьвятленьня сапраўднага твару пералічаных вышэй асоб.

А. Фандарэнка.

Распачалася чыстка ячэйкі КП(б)Б у менскім рабфаку БДУ.

У ячэйцы ня была разгорнута самакрытыка.—Сацспаборніцтва было праведзена зьверху.

Чыстка шэрагаў партыі на менскім рабфаку БДУ набывае вялікае палітычнае значэньне.

З дакладу бюро ячэйкі відаць, што за апошні час ячэйка менскага рабфаку прарабіла вялікую палітычную і культурную працу, зрабіўшы рашучы пералом у бок выпраўленьня зробленых памылак, што было яскрава адзначана старшынёю праверкому. Ячэйка своечасова рэагавала на права апартуністкія выступленьні некаторых таварышоў, не затрымліваючыся перад фактам выключэньня іх са сваіх шэрагаў.

Ячэйка таксама пасьпяхова змагалася і з рознымі левымі загібамі, якія і ў сучасны момант пры кожным выпадку паказваюць свой агідны дробнабуржуазны мяшчанскі твар. Левы загіб на рабфаку, як і ўсюды, страціўны пад сабою грунт (якога ён, дарэчы, і нямеў), праяўляецца ў бязглуздым схалястычным фразёрстве.

Асноўны склад ячэйкі—рабочыя. Ячэйка праводзіла правільную бальшавіцкую лінію, лінію партыі.

Пераважная большасьць партыйцаў—з партыйным стажам з 1926 г. Гэта—маладыя таварышы, сярод якіх бюро ячэйкі не вяло належнай выхаваўчай працы.

Ня гледзячы на тое, што ячэйка прарабіла значную арганізацыйна-палітычную працу, ня гледзячы на шэраг дасягненьняў у іншых галінах партыйнае працы, заўважваецца, што самакрытыка між членамі партыі рабфаку была разгорнута недастаткова. Іншы раз яна прымала непажаданыя формы, выліваючыся ў бясплодныя «філёзофскія» дыспуты.

Выступаючыя ў спрэчках таварышы, а асабліва жанчыны камуністкі падкрэсьлівалі, што з боку паасобных таварышоў партыйцаў з кіруючага складу ячэйкі былі **выпадкі яўнага зажыму самакрытыкі**, што падцьвердзілася тут-жа на сходзе, калі партыйцы сваім гоманам не давалі гаварыць жанчынам.

Старшыня праверкому канстатаваў, што няма дастатковага адзінства між настаўнікамі партыйцамі і беспартыйнымі. Кіраўнічая роль настаўнікаў-партыйцаў у працы рабфаку не адчувалася.

Сувязь з масамі і з падшэфным Менскім хлебазаводам, амаль што, адсутнічае; нямае яе і з вайсковымі часткамі. Справа дайшла да таго, што некаторыя таварышы з бюро ячэйкі ня ведаюць сваіх падшэфных вайсковых частак.

Партыйная дысцыпліна між членаў партыі рабфаку недастатковая. Партузысканьні, нават за сур'ёзныя парушэньні ўставу партыі і партыйнай этыкі, зусім нязначныя.

Сацыялістычнае спаборніцтва на рабфаку амаль што зусім адсутнічае. Яно насаджвалася зьверху. На агульны сход студэнтаў пункты ўмоў між кур самі былі вынесены толькі на зацьвярджэньне, а не на дэталёвае абгаварэньне. Ініцыятарам спаборніцтва не зьяўляюцца самы масы (студэнцтва ў гэтым напрамку абыйшлі кіруючыя таварышы з бюро ячэйкі).

У працы камсамольскай ячэйкі на рабфаку ніхто не дапамагаў: яна была прадастаўлена сваім уласным сілам.

На рабфаку справа васпітацыі знаходзіцца ў занепадзе, што зьяўляецца, бязумоўна, вялікім недахопам у працы бюро ячэйкі.

Другі дзень пасяджэньня праверачнай камісіі не абыйшоўся без чарговай вылазкі нашага клясавага ворага на ідэолёгічным фронце, якое яскрава выразілася ў выступленьні выкладчыка эканамічнай гэаграфіі **гр-на Малеева**. Гэты грамадзянін у рэзкай форме сказаў, што эканамічнай гэаграфіі нельга абяртаць у палітэканомію; ён хацеў даказаць, што эканамічная гэаграфія зьяўляецца абстрактнаю навукаю, якая нічога супольнага ня мае з палітыкай.

Больш таго, ён узяў на сябе сьмеласьць заявіць, што беспартыйнае настаўніцтва знаходзіцца ў загоне, застрашана, пакрыўджана...

Праўда, гэткія погляды падзяляюцца зусім нязначнай часткай настаўніцтва, доказам чаго зьяўляецца выступленьне выкладчыка беларускае літаратуры **тав. Сьцепановіча. Тав. Сьцепановіч ад імя ўсяго настаўніцтва пратэставаў супроць выступленьня і заявіў, што лепшая частка настаўніцтва рабфаку і далей будзе шчырым памочнікам партыі і ўлады ў будаўніцтве сацыялізму.**

Мабілізуем масы на праверку дагавароў па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Праверка палітычна-гаспадарчых дагавароў выявіла шэраг недахватаў: слабасьць кіраўніцтва з боку прафсаюзаў ударнымі брыгадамі, адсутнасьць шырокай масавай працы сярод рабочых, шмат параднасьці ў сацыялістычным спаборніцтве і недастаткова практычнага выкананьня дагавароў.

Моладзь ідзе ў авангардзе.

(Г. Мазыр).

Сацыялістычнае спаборніцтва, пачатае камсамолам, прывабіла таксама і дарослых рабочых па ўсіх нашых заводах. Мы ўжо цяпер маем некаторыя дасягненьні ў справе ліквідацыі прагулаў. Прыкладна, па заводу „Зорка" да пачатку сацспаборніцтва мелася ў сярэднім 30 прагулаў, альбо 55 рабочых дзён, а ў сучасны момант—7, альбо 10 дзён; на ф-цы „Чырвоны Кастрычнік" раней было 10, зараз усяго толькі 3.

На заводзе „Зорка" па ініцыятыве ячэйкі ЛКСМБ былі арганізаваны спэцыяльныя брыгады выключна з моладзі, якія праводзілі спаборніцтва з дарослымі рабочымі, ставячы мэты большага выробу прадукцыі, зьніжэньне браку і г. д. Неабходна зазначыць, што групы сябе поўнасьцю апраўдалі, яны дапамаглі ўцягнуць сваім энтузіязмам працы астатнія масы дарослых рабочых. На фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» за 3 квартал 29 г. вытворчасьць працы ўзьнялася на 13 проц. пры росьце зарплаты на 12 проц.; па заводу „Зорка"—на 11 пр. пры росьце зарплаты на 20 пр., па заводу „Пралетары" вытворчасьць працы—на 9,59 пр. пры росьце зарплаты на 8,5 проц., на цукернай фабрыцы ў м. Нароўлі „Чырвоны Мазыранін" цьвёрдая карамель выпрацоўвалася па месяцах такім чынам: красавік—55 клгр., май—58 клгр., а ў чэрвені—59 клгр. 200 грам, пры росьце зарплаты на 8 проц. З вышэйпаказанага відаць, што па ўсіх гэтых прадпрыёмствах ёсьць рост вытворчасьці працы за кошт узьняцьця інтэнсыўнасьці нагрузкі рабочага дню, а не за кошт тэхнічнага абсталяваньня.

На зьніжэньню сабекошту трэба адзначыць, што зьніжэньне вельмі нязначнае за выключэньнем лесапільнай вытворчасьці. Гэта тлумачыцца тым, што ў некаторых выпадках вытворчыя праграмы былі складзены нерэальныя, бяз вучоту магчымасьці прадпрыёмстваў зьнізіць сабекошт. З боку вытворчых нарад завкомаў, ячэек ЛКСМ ня было зьвернута дастатковай увагі справе зьніжэньня сабекаштоўнасьці, у выніку чаго няма тых рэальных эфэктаў, якія-б мы павінны былі атрымаць.

Адносна палепшэньня якасьці прадукцыі за 3 квартал па некаторых прадпрыёмствах маецца некаторае пагоршаньне супроць мінулага году, што можна тлумачыць тым, што ў першы час, калі прыступілі да працы па сац. спаборніцтву, больш увагі аддавалася колькасьці, што і адбілася на якасьці прадукцыі. З боку моладзі ўнесена шэраг новых прапаноў па пытаньнях рэжыму эканоміі, рацыяналізацыі вытворчасьці, аб правільным сартураваньні дошак і г. д.

На фабрыцы „Прафінтэрн" у дарослых рабочых уходзіць 725 лістоў шкляной паперы на 770 дашок, у моладзі ўходзіць на 863 дашок 325 лістоў. Трэба заўважыць, што з боку гаспадарнікаў маліся наплявацельскія адносіны да прапаноў моладзі. Слаба прыцягваліся да сац. спаборніцтва інжэнэрна-тэхнічныя сілы, а таксама слаба папулярызавалася тэхнічная літаратура сярод дарослых рабочых і моладзі.

Я. Саидамірскі.

Праверка пачалася з спазьненьнем.

Ня гледзячы на тое, што дырэктывы аб праверцы сацспаборніцтва былі дадзены своечасова, праца на **швэйнай ф-цы „Кастрычнік" (Менск)** разгарнулася з вялікім спазьненьнем.

Праведзеныя сходы па цэхах і зьменах падагулілі і абгаварылі ход спаборніцтва, на ф-цы абрана праверачная камісія і часова-кантрольная камісія.

Разам з праверкай дагавораў ідзе апрацоўка прамфінпляну.

Сацспаборніцтва, як паказваюць папярэднія вынікі праверкі, разгарнулася на ф-цы досыць шырока і праходзіць з вялікім уздымам. Арганізаваныя па ўсіх цэхах рабочыя брыгады могуць служыць узорам, як трэба працаваць. Ударныя брыгады—лепшы паказчык працы.

Слаба ўцягнуты ў спаборніцтва новыя кадры рабочых. Трэба адзначыць, што якасьць прадукцыі палепшана не ў дастатковай ступені.

У хуткім часе склікаецца агульнагарадзкая канфэрэнцыя для падагульненьня вынікаў сацспаборніцтва і заключэньня новага дагавору.

М.

На ходу сацыялістычнага спаборніцтва.

(*Завод „Бальшавік", г. Менск*).

Для праверкі ходу сацыялістычнага спаборніцтва на заводзе «Бальшавік» у паасобных яго цэхах, а таксама аддзяленьнях цэхаў вылучаны былі ўдарныя брыгады. Зараз ужо можна падвесьці першы балянс працы ўдарных брыгад.

Перш за ўсё неабходна адзначыць, што некаторыя брыгады цэхаў і аддзяленьняў цэхаў не прыступілі да працы, або позна яе распачалі. У зольным аддзяленьні чырвонадубнага цэху хоць і была ўдарная брыгада, але працы сваёй не паказала, наадварот самі брыгадзіры замест палепшаньня якасьці прадукцыі псавалі яе. У працэсе прамыўкі кожы ў кіслаце дабаўлялі ваду, ад чаго тавар трэскаўся. У мэханічным цэху ўдарная брыгада з 7 асоб нідаўна толькі распачала працу.

Як буйны недахоп трэба адзначыць, што тавар некаторых брыгад ня выяўлен у працэсе працы, таму што брыгада ня робіць прапаноў, паказаньняў у палепшаньні працы.

Напр.: ударныя брыгады чырвонадубнага цэху, пасадачнага і дубільнага аддзяленьня нават не наведвалі вытворчых нарад. Старэйшыя рабочыя не запісваюцца ў брыгады (чырвонадубны цэх), майстры не дапамагаюць у працы. У той час, як рабочыя ўступаюць у спаборніцтва, майстры і некаторы тэхпэрсанал стаіць у баку ад спаборніцтва (жэлаціны цэх). Іншы раз брыгады не сустракаюць актыўнага падтрыманьня і самае галоўнае па некатарых цэхах ня зьбіраюцца нарады брыгад. Усе гэтыя ненармальнасьці цягнулі за сабой дрэнныя вынікі працы. Можна сумнявацца ці будзе выканан дагавор у мэханічным цэху; па чырвонадубнаму цэху дагавор таксама слаба выконваецца. Вось ценявыя бакі ходу сацыялістычнага спаборніцтва на зав. „Бальшавік".

Неабходна зараз паказаць на шматлікія дасягненьні па сацыялістычнаму спаборніцтву на заводзе. Па жэлацінаму цэху ў выніку заключэньня дагавору з ласчным цэхам маецца палепшаньне працоўнай дысцыпліны, узьняцьце вытворчасьці працы на 100 проц. па зольнаму аддзяленьню жэлацінага цэху. Рэзачнае аддзяленьне перавысіла заданьне па ўзьняцьцю вытворчасьці працы па 50 пр. Якасьць золкі палепшылася на 75 пр. Рабочыя жэлцэху за паўтара м-ца ўпесьлі 20 прапаноў, якія ўжо выкананы. Нормы выпрацоўкі ў зольным аддзяленьні былі павышаны ўдарнай камсамольскай брыгадай на 100 пр.

Сыпучыкі каніны далі 8 процантаў зьніжэньня сабекошту. Многія рабочыя бяруць на сябе абавязак выконваць большую работу, чым яна выконвалася раней. Рабочы Бабровіч, напр., адмовіўся ад свайго памоцніка і выконвае адзін працу, і дае добрай якасьці прадукцыю. Каб мець яшчэ большыя дасягненьні, неабходна ў будучым практыкаваць чарговыя нарады ўдарных брыгад, вывучаць некаторыя працэсы, палепшаць працу вытворчых нарад, забясьпечыць масавае рабочае падтрыманьне ўдарных брыгад, уцягнуць усю рабочую масу ў спаборніцтва. Завкому і другім заводзкім арганізацыям павесьці рашучую выхаваўчую працу. Майстрам, тэхнічнаму і інжынэрнаму складу неабходна прыняць больш актыўны ўдзел у спаборніцтве. Дагаворы па сацспаборніцтву павінны быць выкананы.

П.

Што паказала праверка дагавору

(Менск. Хлебазавод).

Праверка дагавору сацспаборніцтва на нашым заводзе амаль скончана. Пытаньне было шырока абгаворана на сходзе прафактыву. Дагавор рабочымі амаль поўнасьцю ажыцьцёўлены, вытворчая праграма выканана поўнасьцю, зьніжан сабекошт, норма выработкі ўзьнята на 20 проц., без павялічэньня заработнай платы. Праз выклікі ўдалося ўцягнуць у сацспаборніцтва ўсіх рабочых заводу.

Трэба адзначыць значныя дасягненьні ў эканоміі апалу. Так па пляну было прадугледжана правесьці эканомію на 8 проц., заданьне выканана з перавышэньнем на 3 проц. Характэрна, што адміністрацыя адмовілася выдаць узнагароду качагару за эканомію апалу.

Нядаўна быў праведзен вечар, прысьвечаны вынікам сацспаборніцтва, на якім рабочыя абяцалі ўсе сілы прылажыць па выкананьню вытворчай праграмы бягучага гаспадарчага году.

Сацспаборніцтва зараз разгортваецца паміж цэхамі, групамі рабочых з неаслабным тэмпам.

Рабочы.

Замест спаборніцтва—цеганіна.

(Ліст з Магілева).

Магілеўскае акруговае аддзяленьне Лесбелу яшчэ ў траўні месяцы выклікала па цэламу шэрагу пытаньняў на сацыялістычнае спаборніцтва Гомельскае аддзяленьне Лесбелу.

Супрацоўнікі Гомельскага аддзяленьня выклік быццам прынялі. А калі магілеўскімі лесбелаўцамі быў распрацаваны і падпісаны дагавор і дасланы ў Гомель для канчатковага афармленьня, дагавор замарынаваўся. І марынуецца вось ужо болей як 2 месяцы.

Між іншым, у дагаворы ёсьць пункт аб зьвішчэньні цеганіны.

А тутака выходзіць, што Гомельскі калектыў Лесбелу ўтварае самую ўзорную цеганіну ў афармленьні дагавору.

Л.

У спаборніцтвах савецкіх гаспадарак многа параднасьці.

З агульнай колькасьці савгасаў Аршанчыны ў сацыялістычнае спаборніцтва ўступілі толькі савгасы: „Хо лаўе», Станіслава, Леніна, Забалацьце, Бабінічы, Высокае, Вусьце, Райцы, Межава, Скрыншчына і Крывое. Паміж імі заключаны дагаворы, падпісаныя прадстаўнікамі двух бакоў. У гэтых дагаворах ёсьць пункты: узьняцьце вытворчасьці працы на 5—7 проц., пераход на зьдзельшчыну, падвышэньне ўраджайнасьці, пашырэньне пасеўнай плошчы, зьніжэньне сабекошту прадукцыі, дапамога бяднейшаму сялянству, шэфства над вёскай, арганізацыя ў вёсках вытворчых аб'яднаньняў, вызаў вёсак альбо калгасаў на спаборніцтва, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод рабочых савгасаў, зьнішчэньне прагулаў і т. д.

Некаторыя з дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву не канкрэтны. Некаторыя савгасы ўступілі ў спаборніцтва вясной, некаторыя сярод лета і некаторыя перад асеньній сяўбой. Ёсьць выпадкі, калі дагаворы заключаліся на год, альбо і зусім без усякага тэрміну. Толькі дагавор савгасаў Забалацьце і Бабінічы вылучае канкрэтныя мерапрыемствы, якія савгасы мяркуюць правесьці.

Саюз сельгаслесрабочых сваімі сіламі, а таксама і сіламі ўпаўнаважанага Белсельтрэсту праверылі выкананьне дагавораў па спаборніцтвах савгасамі Забалацьце, Бабінічы і імя 1 мая. Савгас Бабінічы і Забалацьце амаль што ўвесь дагавор па спаборніцтву выканалі.

Частковая праверка выявіла таксама і адмоўныя бакі спаборніцтва. Нідзе ў савгасах няма спаборніцтва паміж асобнымі групамі рабочых. У некаторых савгасах дагаворы ляжалі пад сукном, а рабочыя аб гэтым нічога ня ведалі, як ня ведалі і наогул, што савгас уступіў у спаборніцтва. Рабочыя працавалі звычайным парадкам, ня ведаючы, на якую галіну працы ў гаспадарцы патрэбна зьвярнуць найбольшую ўвагу.

Савгас Станіслава ўступіў у спаборніцтва толькі таму, што гэта была „кампанія".

— Усе ўступаюць,—казаў кіраўнік савгасу,—ну і мы ўступілі. Абы выканаць:

Пасьля заключэньня дагавору, ён ляжаў, пакуль ня прыехалі прадстаўнікі савгасу Леніна для праверкі выкананьня дагавору.

Ёсьць і такія савгасы, якія маўчаць і ў спаборніцтва ня ўступаюць. Іх ніхто не вызывае і яны ня хочуць каго небудзь вызваць. Возьмем, напрыклад, савгас Высокае. Калі акруговае праўленьне саюзу сельгаслесрабочых запыталася як яны выконваюць дагавор, дык савгас Высокае адказаў коратка і ясна:

— Нас ніхто не выклікаў на спаборніцтва.

Трэба адзначыць, што такіх савгасаў, якія лічылі неабходным чакаць і маўчаць пакуль ня пройдзе „кампанія па спаборніцтвам"— ёсьць на Аршаншчыне ня мала.

У саюзе ёсьць хоць якія-небудзь зьвесткі аб спаборніцтвах і выкананьні дагавораў, а што датычыцца ўпаўнаважанага Белсельтрэсту,—дык у яго вядома толькі адно, што савгасы ў спаборніцтва ўступалі, як ідзе выкананьне дагавораў—нічога невядома. Гэты недахоп павінен быць выпраўлен. Параднасьць трэба зьнішчыць, а ўзяцца за канкрэтнае выкананьне і праверку дагавораў.

М.

Дэлегаткі на вёсцы—пад сьцяг калектывізацыі.

Перавыбары дэлегацкіх сходаў жанчын на вёсцы трэба скарыстаць для прапаганды ідэй калектывізацыі.

ПАКІДАЮЦЬ СТАРОЕ.

(З перавыбараў дэлегацкіх сходаў жанчын).

КУТКІ СПАДЧЫНЫ МІНУЛАГА.

Спадчына агіднага старога мінулага; яра, некультурнасьць, прадзедаўскія прымітыўныя спосабы працы, якія надрываюць людзкія сілы і не даюць гаспадарчага эфэкту, індывідуалістычная псыхалёгія яшчэ моцна трымаюцца ў жыцьці і быту жанчыны-сяла ці многіх куткоў беларускай вёскі.

У летні час, падымаючыся разам з „першымі пеўнямі", яна смажыцца каля печы, перакідаючы в рухі на руку замусолены качаражнік, вухліва рыхтуе сьнеданьне, абед; адрываючыся, даглядае скаціну, бяжыць в даёнкаю пад карову. А потым—на цалюткі дзень у поле... Нявыпростваючы сьпіны, з сярпом у руках сабірае па жменьцы хлеб на сваёй вузенькай палосцы, час ад часу праціраючы рукавом зрэбнай кашулі свой потны твар.

Узімку ад сьвету і да глыбокай ночы, як-бы прыкутая да прасьніцы старальна лапочучы калаўротам суча ніткі—кужаль, зрэб'е, і, раз-по-разу прыкладаючыся языком да ніткі, сьлюніць пасму кудзелі.

ВЯЛІКІ ЗРУХ.

Але прадставіць сабе быт жанчыны-сялянкі толькі з такога погляду, аднабакова, было-б памылковым, не аднавядаючым сапраўднасьці сучаснасьці савецкай вёскі і таму вялікаму зруху ў працы і быту вясковай жанчыны—батрачкі, бяднячкі і серадняцкі.

12 гадоў існаваньня савецкай улады ўнесьлі грунтоўную ломку ў жыцьці і быту вёскі. З кожным годам паляпшаецца эканамічнае становішча бяднякоў-серадняцкіх пластоў вёскі і гэта палепшаньне ідзе па шляху сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Усё вышэй і вышэй узьдымаецца іх культурны ўзровень і палітычная сьвядомасьць. Расьце культурна і палітычна працоўная жанчына вёскі. Яна становіцца сапраўды раўнапраўнай побач з мужчынай, пісьменнай, актывісткай на савецкай і грамадзкай працы. Яна актыўна ўдзельнічае ў сацыялістычным будаўніцтве. Сотні працоўных жанчын на кіруючай, адказнай савецкай, каапэрацыйнай і іншай працы. Яны наступова, але рашуча становяцца на шлях выхаду ад прыгнятаючай яе кухні, ад дамашняй гаспадаркі, ад прымітыўнага бытавога становішча. Гэты шлях—калектывізацыя.

Жанчыны-калгасьніцы Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, якія прыехалі на дэлегацкую канфэрэнцыю на прыгожых параконных фурманках, маючы кучарам самога старшыню калгасу, па сьвяточнаму адзетыя, якія пакінулі на спадзейныя рукі ў чыстаце сваіх дзяцей у калгасных ясьлях, зрабілі вялікі ўплыў на жанчын-дэлегатак, калі заявілі:

— Нам зараз страшна падумаць, калі зноў прышлося-б жыць у паасобку, жаць сярпом і прасьці кудзелю. Тэхніка прышла на дапамогу чалавеку, мы яе карыстаць можам толькі ў буйных калектыўных гаспадарках. Працаваць нам стала лягчэй і жыцьцё наша на шмат палепшылася.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ УВАГА ГАЛОЎНАМУ ПЫТАНЬНЮ.

Задача калектывізацыі—была цэнтральным пытаньнем у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў. Доўгія вельмі ажыўленыя спрэчкі цягнуліся па гэтаму пытаньню. Розныя погляды. Яны характарызуюць клясавае пачуцьцё розных пластоў вёскі, культурны ўзровень і сьвядомасьць савецкай часткі сялянак і традыцыйныя звычаі селяніна-беларуса ці сялянкі: «памацаю ўласнымі рукамі, тады паверу».

ПЕРАКОНВАЮЦЦА.

У многіх раёнах Менскай акругі дэлегацкія сходы прарываліся, паладжваліся экскурсіі ў калгасы, дзе ўважліва прыглядаліся і распытвалі экскурсанткі ўсе ўмовы жыцьця і працы. У выніку—значны пералом. Дэлегаткі ў сваёй большасьці пераконваліся ў выгодах буйнай калектыўнай гаспадаркі. Яны гучна аплёдыруюць прамоўцам-калгасьнікам. І калі на 19-е кастрычніка Грэскім райкомам партыі быў прызначан суботнік для дапамогі калгасу «Чырвоны Маяк» і гэта пытаньне было абгаворана на дэлегацкіх сходах, у гэты-ж дзень раніцою 32 дэлегаткі новага складу зьявіліся на працу ў калгас, прышоўшы некаторыя з іх за 10 вёрст.

У другіх райёнах жанчыны пачалі праводзіць збор сродкаў на пабудову трактарнай калёны.

НЕ ПРЫНІЖАЦЬ ЗНАЧНАСЬЦІ ПРАЦЫ.

— Не па рабоце сярод жанчын дзецца ацэнка рабоце партыйнай арганізацыі,—дакорліва адказаў адзін з сэкратароў райкому на заўвагу аб слабым удзеле партыйнай арганізацыі ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў. Гэткаю заявою прыкрываецца няправільны і вельмі шкадлівы погляд, што праца сярод жанчын—справа жаночага арганізатара. У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі былі выпадкі зрыву сходаў з прычыны адсутнічаньня на дэлегацкіх сходах камуністаў, якія былі вылучаны для правядзеньня гэтай працы. Некаторыя сходы прышлося адмяніць так, як у склад дэлегатак абраны нежаданыя кандыдатуры, не аднавядаючыя ўстаноўцы партыйных дырэктыў—у паасобных выпадках былі абраны кулачкі.

Вялікую ўвагу павінны былі надаць вясковыя райкомы падбору і вылучэньню кіраўнікоў дэлегацкімі сходамі, але фармальны падыход і ў гэтым пытаньні сустракаецца. Напрыклад, у Шацкім сельсавеце кіраўніком вылучан таварыш, які атрымаў вымову на чыстцы за многажонства, які аўтарытэтам сярод жанчын не карыстаецца.

Пытаньне далейшай працы сярод жанчын набывае ў сучасны момант вялікую значнасьць і гэту значнасьць партыйным арганізацыям чельга ні ў якім выпадку прыніжаць.

Я. Івашын.

Рыхтуемся да перавыбараў дэлегатак.

(Калінкавіцкі раён, Мазырскай акругі).

Для правядзеньня падрыхтоўчай працы да перавыбараў дэлегацкіх сходаў, праведзена раённая нарада сэкратароў ячэек КП(б)Б і кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў, раённая канфэрэнцыя батрачак сумесна з калгасьніцамі, савгасьніцамі і грамадзкімі працаўніцамі, інструкцыйная нарада ўпаўнаважаных ад раёну.

На раёнай канфэрэнцыі жанчын сялянкі казалі, што „неабходна вучыцца", мы баімся ісьці ў калгас, бо кулакі і заможнікі агітуюць супроць гэтага, кажучы „прыдуць палякі і паб'юць усіх уступіўшых у калгасы".

На вясковых сходах сялянкі-батрачкі актыўна выступаюць супроць заможніц. Характэрна адзначыць, калі сялянка-бядняка, калгасьніца — Чвей Каця на жаночым сходзе сказала «трэба выгнаць са сходу кулачак, бо яны прыйшлі нас дурманіць (бяднячак) і хочуць „падарваць нам пабудову калектываў", тут пачаліся лаянкі паміж заможніцамі і бяднячкамі, у в. Халодзікі Маскалевіч Каця — бяднячка-калгасьніца на агульным сходзе жанчын заклікае ўсіх бяднячак-батранак ў калгас і кажа: «Мы цяпер не клапацімся аб вцпратцы і абутку нашых дзяцей-школьнікаў, бо ў нас ёсьць праўленьне калгасу, якое пра гэта клапаціцца".

Сіламі дэлегатак камунарак Даманавіцкага сельсавету абсьледаваны спажывецкая с-г. каапэрацыя і сельсавет па пытаньню прыцягненьня жанчын практыкантак да практычнай працы, абсьледаваньнем выяўлена, што частка жанчын упаўне сябеапраўдала на практычнай працы. Напрыклад, сябра Даманавіцкага сельсавету Качан Прося была ініцыятарам па арганізацыі чырвоных абозаў у часе хлебазагатовак, першая запісалася ў калгас і пацягнула за сабой яшчэ 6 сялянак, па яе ініцыятыве зьнята з бедняка страхоўка, які быў абкладзен няправільна, цяпер яна падала заяву і рыхтуецца ў партыю.

Усё яшчэ да гэтага часу назіраюцца бюракратычныя адносіны да працы з жанчынамі, незразуменьне задач партыі па гэтаму пытаньню.

„Мы ня ўсім сябрам сельсавету жанчынам давалі практычную працу, бо вядома жанчына, калі-б і даручалі, што дык ня выканала-б",—кажа сэкратар Даманавіцкага сельсавету (згорбіўшыся) тав. Зайцаў.

Рэкорд па гэтаму пытаньню пабіў бухгальтар Даманавіцкага спажывецкага таварыства Губчык, калі дэлегаткі запыталіся: „што вы зрабілі, чым вы дапамаглі вашаму сябру праўленьня жанчыне, каб навучыць яе працаваць». Што вы хочаце з гэтых жанчын,—кажа з насьмешкаю Губчык,—яны ня ведаюць як працаваць і ня хочуць, ды і наогул, нам няма часу займацца гэтым пытаньнем». Даманавіцкія каапэратары да гэтага часу ня ведаюць, што ў іх маюцца прымаванымі дэлегаткі.

Наогул у час падрыхтоўчай працы да перавыбараў вылучена шмат нядбайных адносін да жаночай працы па ўсяму раёну.

Пара ўжо задумацца і над гэтай працай, бо ў кожнай установе на чале працуе партыец.

Коцін.

Дэлегацкія сходы жанчын праходзяць пад лёзунгам хутчэйшай калектывізацыі.

У Сакаловіцкім сельсавеце, Крупскага раёну (Аршаншчына), 20 кастрычніка праводзіўся сход жанчын в. в. Сакаловічы, Апенковічы і Рэпішча, дзе жанчыны як ніколі паказалі сваю актыўнасьць ва ўдзеле па сацыялістычнай перабудове вёскі, яны патрабавалі хутчэйшага тэмпу калектывізацыі, каб узмацніць свой дабрабыт, таксама прынесьлі падзяку прадстаўніку РК КП(б)Б затое, што апошні прыехаў і правёў з імі сход, бо дагэтуль ніякай сярод іх працы не вялося.

Селькор Гармазінскі.

„Без руля и без ветрил".

Цукерачная ф-ка «Прогресс».

Брыгада па праверцы дагавору па сацспаборніцтву на цукерачнай ф-цы «Прогресс» выявіла, што спаборніцтва праходзіць вельмі вяла, бяз удзелу мас.

Нават зараз, у часе праверкі дагавору, ніякага ўздыму ў працы няма, адсутнічае належнае кіраўніцтва як з боку завкому, гэтак і ячэйкі.

Некаторыя групы рабочых аб спаборніцтве нават і ня ведалі. Так, у бісквітным цэху сярод рабочых ні разу не стаяла сур'ёзна пытаньне аб значэньні сацспаборніцтва.

У завёртачным цэху быў такі выпадак, калі аб значэньні спаборніцтва «растлумачваў» рабочым бухгальтар. Ён казаў:

— Калі прымеце ўдзел у спаборніцтве, паменшыце сваю заработную плату...

Адміністрацыя таксама ніякага ўдзелу ў спаборніцтве ня прымае, нават ня цікавіцца гэтым пытаньнем. Вытворчая камісія працуе дрэнна.

Дагавор па сацспаборніцтву, заключаны з Гомельскай фабрыкай, застаўся толькі на паперы.

Трэба адзначыць, што праводзімая зараз праверка ўзьняла актыўнасьць рабочых, штодзённа паступаюць шмат заяў аб жаданьні ўдзельнічаць у спаборніцтве. Разгортваюцца выклікі па цэхах на ўзьняцьце працоўнай дысцыпліны, палепшаньні якасьці прадукцыі.

У Прэзыдыуме ЦВК БССР.

27-ГА КАСТРЫЧНІКА 1929 Г. ПАД СТАРШЫНСТВАМ ТАВ. А. Г. ЧАРВЯКОВА АДБЫЛОСЯ ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР. НА ГЭТЫМ ПАСЯДЖЭНЬНІ РАЗАМ З ІНШЫМІ БЫЛІ РАЗГЛЕДЖАНЫ НАСТУПНЫЯ ПЫТАНЬНІ:

Аб перападрыхтоўцы работнікаў нізавога савецкага апарату.

Заслухан даклад Аргаддзелу Прэзыдыуму ЦВК аб выніках перападрыхтоўкі работнікаў нізавога савецкага апарату.

У зьвязку са значным аднаўленьнем складу саветаў пры перавыбарах, Прэзыдыумам ЦВК яшчэ ў красавіку месяцы г. г. была прынята пастанова аб перападрыхтоўцы складу сельскіх саветаў па вызначанай сыстэме.

У выкананьне гэтай пастановы зроблена наступнае: акруговыя курсы праведзены па 6 округах (за выключэньнем Менскай і Мазырскай), 85 райённых правялі ў сябе каротка-тэрміновыя курсы па саветах і райённыя курсы. Па саветах каротка-тэрміновымі курсамі ахоплена 80 проц. складу ўсіх членаў саветаў. Праз каротка-тэрміновыя райённыя курсы-нарады прапушчан увесь склад старшынь і сакратароў сельскіх саветаў. Лепш за ўсе акруговыя курсы праведзены па Віцебскай акрузе, дзе ў дзьве чарогі прапушчан амаль увесь склад старшынь і сакратароў саветаў; астатнія акругі правялі таксама курсы але з меншым ахопам. У горадзе Менску пры ЦВК БССР акрамя таго былі праведзены: палтарамесячныя цэнтральныя курсы жанчын старшынь і сэкратароў сельсаветаў (галоўным чынам), праз якія прапушчана 50 чалавек, і месячныя курсы старшынь і сэкратароў нацсаветаў, праз якія прапушчана 53 курсанты. Наогул акруговымі і цэнтральнымі курсамі ахоплена 40 проц. агульнага складу сталых працаўнікоў саветаў. Выкладаньне праходзіла па вызначанай Аргаддзелам Прэзыдыуму ЦВК праграме. Курсы праведзены ў асноўным здавальняюча.

Прэзыдыум ЦВК па заслуханым удакладу канстатаваў, што сыстэма курсаў цалкам сябе апраўдвае і дапамагае ўзьняцьню палітычнага ўзроўню і практычных ведаў работнікаў саветаў.

На будучы час прызнана неабходным праводзіць штогодна курсы работнікаў сельсаветаў і разам з тым узмацніць завочнае навучаньне апошніх праз шырокае прымяненьне завочных курсаў.

Пра перадачу дзяцей на выхаваньне ў працоўныя земляробскія гаспадаркі.

Заслухан даклад Цэнтральнай Камісіі Дапамогі Дзецям пры ЦВК БССР і даклад Менскага АВК (у адносінах Менскай акругі) аб выніках перадачы дзяцей на выхаваньне ў працоўныя земляробскія гаспадаркі. У пачатку 1928 г. (23 лютага) урадам быў выдадзен закон, які прадугледжвае шэраг льгот для тых земляробскіх гаспадарак, якія бяруць на выхаваньне дзяцей дзіцячых дамоў. З дакладу высьветлілася, што дзякуючы недастатковай папулярызацыі паказанага закону, у працоўныя гаспадаркі за мінулы час перададзена зусім нязначная колькасьць дзяцей на выхаваньне.

Члены Прэзыдыуму ЦВК, якія выступалі ў спрэчках, паказвалі на неабходнасьць перадачы дзяцей на выхаваньне выключна ў калектыўныя і савецкія гаспадаркі, зусім адмовіўшыся ад мэтаду перадачы іх у індывідуальныя сялянскія гаспадаркі.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў: адзначыць, што з боку НК Асьветы, НКЗему і акрвыканкому зроблена вельмі мала для папулярызацыі сярод шырокіх мас насельніцтва закону пра перадачу дзяцей на выкаваньне ў працоўныя земляробскія гаспадаркі; даручыць СНК перагледзіць закон у той частцы, дзе гаворыцца пра перадачу дзяцей у індывідуальныя сялянскія гаспадаркі.

Аб дзейнасьці АКВК.

Зацьверджана пастанова па дакладу аб дзейнасьці Асобнай Калегіі Вышэйшага кантролю па зямельных справах.

Прэзыдыум ЦВК адзначыў, што АКВК у сучасным яе складзе зрабіла захады да спраўленьня памылак і выпадкаў скрыўленьня клясавай лініі, якія былі дапушчаны раней пры вырашэньні зямельных спраў і пытаньняў зямельнай палітыкі. Разам з тым у рабоце зямельнага суду і вораз заўважаецца шэраг недахопаў, якія былі адзначаны прэзыдыумам ЦВК яшчэ 28-VII-27 г. па дакладу АКВК, як-та: адсутнасьць дастатковай сувязі з працоўнымі масамі, нездавальняючы падбор работнікаў зямельных камісій, адсутнасьць правільнага інструктаваньня, няўпэўнасьць выпадкаў цеганіны і бюракратызму пры вырашэньні зямельных спраў.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў: даручыць АКВК пры разглядзе зямельных спраў вясьці рашучую барацьбу з праявамі скажэньня клясавай лініі ў зямельнай палітыцы; усю сваю працу праводзіць, выходзячы з неабходнасьці калектывізацыі і вытворчага капэраваньня, не дапушчаючы ўтварэньня хутароў, атрубоў і дробных пасёлкаў, а таксама і драбленьня сельскай гаспадаркі; даручыць НК РСІ, НКЮ і НКЗему ў двухмесячны тэрмін рэдпрацаваць праэкт закону аб рэарганізацыі зямельнага суду ў папрамку перадачы спрэчна-зямельных спраў у веданьне органаў НКЮ з тым, каб за зямельнымі органамі заставіць толькі вырашэньне і зацьверджаньне земляўпарадчых праэктаў; даручыць АКВК у бліжэйшы час правесьці справаздачы на шырокіх сходах рабочых і сялян аб зямельнай палітыцы савецкай улады.

Аб дзейнасьці рэдакцыі „Савецкая Беларусь".

Зацьверджана пастанова па дакладу рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь".

Рэдакцыі прапанавана: аддаць больш месца і ўвагі пытаньням савецкага будаўніцтва; разьдзел афіцыйных пастаноў ураду абавязкова дапаўняць адпаведнымі матар'ыямі, якія-б папулярызавалі закранутыя ў гэтых пастановах пытаньні савецкага будаўніцтва; склады сталы карэспандэнцкі актыў па пытаньнях савецкага будаўніцтва; узяць напрамак на больш шырокае абслугоўваньне газэтай прамысловых рабочых, сялянскага бядняцка-серадняцкага актыву і батракоў праз набліжэньня зьместу у газэты да чытачоў гэтага кантынгэнту; у мэтах больш поўнага скарыстаньня рабселькораўскіх матар'ялаў, складаць раз у месяц зводкі з тых карэспандэнцкіх заметак, якія не зьмяшчаюцца ў газэце, насылаючы гэтыя зводкі ў Наркам РСІ і пракуратуру.

Перад рэдакцыяй пастаўлена задача падваеньня тыражу газэты на працягу бліжэйшага году.

Аб перавыбарах саветаў у 1930 г.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў правесьці у 1930 г. справаздачную і перавыбарчую кампанію сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў і райённых зьездаў саветаў у наступныя тэрміны: сельскіх і местачковых саветаў—з 15-I па 15-II; гарадзкіх саветаў—з 1-II па 1-III; райённых зьездаў саветаў—у працягу сакавіка месяцу.

Назначэньні.

Тав. Несьцер аслабанён ад абавязкаў Намесьніка Старшыні Вярхоўнага Суду БССР.

Член Вярхоўнага Суду БССР т. Гінзбург назначан Намесьнікам Старшыні Вярхоўнага Суду БССР.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра зацьверджаньне дадатковых выбараў Беларускай Акадэміі Навук на пасады віцэ-прэзыдэнта, неадменнага сэкратара Беларускай Акадэміі Навук і членаў прэзыдыуму Акадэміі.

Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацьвердзіць пададзеныя Бел. Акадэміяй Навук кандыдатуры: акадэміка ЯКУБА КОЛАСА (К. М. Міцкевіча) на пасаду віцэ-прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук і Члена Прэзыдыуму Акадэміі;

акадэміка ПЯТРОВІЧА, Івана Андрэевіча, на пасаду Неадменнага Сакратара Беларускай Акадэміі Навук і Члена Прэзыдыуму Акадэміі, панінуўшы за ім сумяшчэньне па пасадзе Намесьніка Старшыні Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры Савеце Народных Камісараў БССР;

т. ПЛАТУНА, Антона Марцінавіча,

т. АШАРОВІЧА, Ільлю Перцавіча і

акад. МАТУЛАЙЦІСА, Станіслава Юркавіча,—Членамі Прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук.

2. Прыняць да ведама, што канчатковы с к л а д Прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук, у зьвязку з праведзенымі дадатковымі выбарамі, складаецца з наступных асоб:

т. ІГНАТОЎСКІ, Усевалад Макаравіча —Прэзыдэнт Акадэміі Навук,

т. БЯЛУГА, Мікалай Ільліч,—Віцэ-Прэзыдэнт Акадэміі Навук,

акад. ЯКУБ КОЛАС (К. М. Міцкевіч)—Віцэ-Прэзыдэнт Акадэміі Навук,

акад. ПЯТРОВІЧ, Іван Андрэевіч,—Неадменны Сакратар Акадэміі Навук,

акад. МАТУЛАЙЦІС, Станіслаў Юркавіч;

акад. ПЛАТУН, Антон Марцінавіч,

акад. НЕКРАШЭВІЧ, Сьцяпан Міхайлавіч і

акад. АШАРОВІЧ, Ільля Перцавіч,—члены Прэзыдыуму Акадэміі Навук.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР

М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР

Л. ДУБАВІЦКІ.

28 кастрычніка 1929 г.
г. Менск.

Адозва Менакрвыканкому

да працоўнага насельніцтва Менскай акругі.

Для таго, каб забясьпечыць належнае хаваньне і своечасовую перавозку прадуктаў патрэбна належная колькасьць тары--мяшкоў.

Акруговы выканаўчы камітэт зьвяртаецца да ўсяго працоўнага насельніцтва з заклікам арганізаваць шырокую прадажу мяшкоў дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям. Наша акруга налічвае 120000 бедняцка-серадняцкіх двароў. Кожнаму бядняцка-серадняцкаму двару бяз шкоды для сваёй гаспадаркі можна прадаць некалькі мяшкоў, што ў агуле дасьць магчымасьць забясьпечыць грузы тарай.

Гарадзкія рабочыя і астатняя частка гарадзкога працоўнага насельніцтва таксама мае мяшкі і павінна, шляхам здачы іх прыняць актыўны ўдзел у справе арганізацыі хаваньня і перавозкі хлебных грузаў.

Акруговы выканаўчы камітэт абвяшчае з 1 па 15 лістапада 2-тыднёвік па загатоўках тары і абавязвае:

а) РВК, гарсаветы, с-саветы, камітэты сялянскай узаемадапамогі, усе каапэрацыйныя ўстановы гарадоў і вёсак, Саюзхлеб, арганізаваць збор тары, забясьпечыў крамы, загатоўчыя пункты, камітэты ўзаемадапамогі адпаведнымі сродкамі для расплаты з насельніцтвам за мяшкі, шырока растлумачыў насельніцтву аб гэтым мерапрыемстве.

б) Акруговы выканаўчы камітэт просіць ЦСПСБ, акруговы камітэт ЛКСМБ, піанэрскія арганізацыі даць дырэктывы сваім низавым арганізацыям аб іх удзеле ў справе збору мяшкоў і праверкі рацыянальнага іх скарыстоўваньня.

Акруговы выканаўчы камітэт упэўнен, што працоўныя масы акругі шчыра адгукнуцца на яго заклік і ў бліжайшы тэрмін здадуць загатавіцелям неабходную колькасьць тары.

Загатоўчыя цэны за мяшкі ўстаноўлены наступныя:

1) Годныя для насыпкі 40 кап.,
2) мяшок які патрабуе рамонту 30 к.

АКРУГОВЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ.

НА ФРОНЦЕ ЗАГАТОЎКІ БУЛЬБЫ.

УЗМАЦНІМ ТЭМП ЗАГАТОВАК.—ЗЬНІШЧЫМ НЕДАХВАТЫ.—ЧАС НЕ ЧАКАЕ, ХУТКА ЗАМАРАЗКІ.

Бульбяныя махінацыі і крэдыты Дняпросаюзу.

Мы ўжо пісалі аб апараце Дняпросаюзу. Вось яшчэ некалькі фактаў.

У сучасны момант праводзіцца масавая загатоўка бульбы. Што-ж робіцца праўленьнем Дняпросаюзу? Згодна існуючых цыркуляраў, правоз бульбы аплачваецца тэй установай, якая закупае бульбу. Дняпросаюз грошы за перавозку бульбы пакідае ў сваю касрысьць для павялічэньня прыбыткаў. Напрыклад, Кругляскае спажывецкае т-ва загатавала 3 вагоны бульбы. Загатоўленая бульба прадаецца Віцебскаму ЦРК, а розьніца за правоз бульбы ад месца загатоўкі да месца пагрузкі кладзецца ў кішэнь Дняпросаюзу. Таксама вытвараецца з загатоўкай трансфа і г. д.

Бухгальтарам Агроскіны аддаецца распараджэньне, што пры праверцы рахункаў з нізавой сеткай выпраўляць толькі тыя памылкі, якія ідуць не ў карысьць Дняпросаюзу. Начальства кажа, а супрацоўнікі робяць,—адгэтуль атрымліваецца масавае аблічэньне нізоўкі. Напрыклад, Кручанскае спажывецкае т-ва было аблічана на 600 руб.

Раскладаўся апарат, раскладаўся і мясцком. Пачалася махінацыя з крэдытам. Тавары набіраюцца на складзе, а мясцком дае гарантыю. У бухгалтэрыі разьнік па набраным рахункам вытвараецца праз 2-3 м-цы. Нягледзячы на тое, што частка супрацоўнікаў плаціць у той час, як атрымлівалі тавары налічанымі грашмі, грошы мясцкомам затрымліваюцца, і гэтымі грашмі мясцком крэдытуе супрацоўнікаў у выглядзе розных авансаў і доўгатэрміновых пазык. Рахункі на выдадзеныя тавары лежаць бяз праводкі ў бухгалтэрыі некалькі месяцаў, а калі ў канчатковым выніку і афармляліся, то грошы аднасіліся на адчынены рахунак мясцкому. Гэтакіх адчыненых рахункаў па кнігам лічацца каля 1.000 руб. Мясцком вядзе сваю сталую справаздачнасьць, у якую залічвае крэдыты супрацоўнікаў. Пэрыядычна ўтвараецца праверка рахункаў паміж мясцкомам і бухгальтэрыяй. Галоўным бухгальтарам мясцкому працаваў сакратар мясцкому Вішкаў.

Махінацыі з атрыманьнем тавараў, авансаў і пазык, а таксама набор тавараў па цэнтральным складзе, павялічалі зарплату супрацоўнікаў Дняпросаюзу на 10-11 проц. Справа ў тым, што згодна існуючых распараджэньняў Белкоопсаюзу і Дняпросаюзу, розьнічная прадажа тавараў са складаў Дняпросаюзу і іншых аптовых арганізацый забараняецца, і гэта зразумела, бо тавары на складзе таней чым у розьнічнай прадажы на 10-11 проц.

Дзеля таго, каб захаваць ад фінаддзелу сумы за атрымліваемыя тавары і ва ўніканьне абкладаньня іх ураўніцельным зборам, рахунак мясцкому лічыўся на кнігам бухгальтэрыі як рахунак дзяржаапэрацыйнай установы.

Вэтэраны грамадзянскай вайны, якія працуюць у Дняпросаюзе на працягу некалькі год, заставаліся рахункаводамі. Аб высоўваньні іх ніхто не паклапаціўся. Нагледзім пратакол мясцкому аб высоўваньні супрацоўнікаў на больш адказную пасаду. І што-ж мы бачым. Дымшыц, Іофэ, Пузрын, Кроль і г. д. А вось тых, каго на самай справе трэба вылучыць, ні слова. Пры вылучэньні прыбіральшчыцы Андрухінай было неафіцыйнае пасяджэньне, на якім казалі, што „вылучыць мы яе вылучым, а калі выкрыецца махінацыя з адчыненым рахункам і наборам тавараў, дык няхай яна і адказвае».

У пратаколе па вылучэньню Пузрына, Дымшыца і інш. тлумачыцца, што неабходна высунуць на пасаду ў агульна-рэспубліканскім маштабе. Згодна пратаколу мы і друкуем у агульна-рэспубліканскім маштабе, каб іншым не павадна было.

З.

Прывезьлі бульбу.

Пасілім загатоўку бульбы.

(Мазыршчына).

Да 25-га кастрычніка з Мазыршчыны адгружана прамысловым цэнтрам 46 вагонаў бульбы, што складае 8,16 проц. васеньнага заданьня. Слабы тэмп загатоўкі і адгрузкі бульбы тлумачыцца ня толькі няўважлівымі адносінамі да работы нізавых загатавіцеляў, але яшчэ і тым, што на працягу 5-га жніўня па 13-е кастрычніка 7 разоў зьмяняліся цэны на бульбу, зразумела, па ініцыятыве акрганделі і па распараджэньням Наркамгандлю. 5-га жніўня бульбяной канвэнцыяй была ўстаноўлена загатавіцельная цана на маладую бульбу для мясцовага ЦРК 80 к. пуд, затым яна паменшылася да 40 кап. пуд, а пасьля гэтага зноў падняслася да 48 кап. пуд. Такім чынам, зьмены цэн падарвалі бульбяны рынак.

Таксама слабая адгрузка бульбы па нарадам у Ленінград тлумачыцца недаацэнкай акрганделем сур'ёзнасьці і важнасьці забясьпечаньня рабочых цэнтраў прадуктамі харчаваньня. Падцьвяраецца гэта пастановай бульбяной канвэнцыі акрганделю: «вывяз бульбы за межы акругі дазволіць акрсельсаюзу і спажыўсаюзу пасьля выкананьня дагавораў здаваленьня бульбай мясцовай прамысловасьці".

Дырэктыўная тэлеграма т. т. Гамарніка і Галадзеда ад 18-га кастрычніка аб пасіленьні адгрузкі бульбы ў першую чаргу рабочым цэнтрам, а таксама аб давядзеньні заданьня па загатоўцы бульбы да сельска-гаспадарчага двара, па вопыту хлебазагатовак, канчаткова разьбіла месьніцтва акрганделю і разварушыла агульную ўвагу акруговых дырэктыўных устаноў гэтай кампаніі.

Адбыўшыйся 22-га кастрычніка Пленум АВК вырашыў пытаньне аб пасіленьні загатоўкі бульбы і даў установу загатавіць на акрузе 775 вагонаў. У мэтах выкананьня гэтага заданьня накіравана ў вёску 20 адказных акруговых працаўнікоў. Вынікі ўжо ёсьць, але ўсё-ж пры паслабленьні гэтай працы заданьне па адгрузцы бульбы Ленінграду можа застацца нявыкананым, бо васеньняя пара не чакае, надыходзяць марозы і пры ўмовах Мазырскага бездарожжа складуцца цяжкасьці ў перавозцы бульбы. Зараз патрэбна аддаць максімум увагі і сілы загатоўкам бульбы ў Мазыршчыне.

Зеляноўскі.

Загатоўка бульбы праходзіць слаба.

(Ліст з Полацку).

Полаччына павінна загатавіць у час бягучай загатоўчай кампаніі 2450 тон бульбы. На 20 кастрычніка загатоўлена толькі 558 тон бульбы, з гэтага ліку акрсельсаюзам 158 тон і спажыўсаюзам 400 тон.

Такім чынам загатоўка бульбы праходзіць слаба. Для практычнага ўдзелу ў загатоўках бульбы акруговымі органамі накіравана шэраг адказных працаўнікоў на райёны, якія правядуць там вялізарную растлумачальную працу сярод сялянства.

Камсамольская арганізацыя гораду распачала кампанію па збору мяшкоў сярод гарадзкога насельніцтва для загатовак. Папярэднія вынікі надзвычайна добрыя. Кампанія працягваецца, у тым ліку і па райёнах.

Трэба напружыць усе сілы, каб з посьпехам выканаць плян.

С. Міхальцоў.

Збор мяшкоў.

Віцебск, 27-X. З 25 кастрычніка па акрузе праводзіцца 2-х тыднёвік па дабраахвотнай здачы насельніцтвам мяшкоў.

Пры РВК для кіраўніцтва гэтай справай вылучаны спэцыяльныя асобы. У сельсаветах зборам мяшкоў будуць кіраваць прэзыдыумы сельсаветаў.

Рабочыя брыгады.

Віцебск, 27-X. Акрпрафбюро вылучыла рабочыя брыгады у колькасьці 50 асоб, якія накіроўваюцца у раёны для загатоўкі бульбы для Масквы і Ленінграду. У вёсцы брыгаднікі працуюць ня менш 2 тыдняў.

Перад адпраўкай з брыгаднікамі праведзена інструктыўная нарада

НЯМА ПАРАДКУ, ЁСЬЦЬ ГАЛАВАЦЯПСТВА

(*Мазырская акруга*).

„Кадушніцтва".

Зноў знайшліся „фабрыканты" па выробу скуры. У м. Тураве, Мазырскай акругі, побач з домам РВК выяўлен «фабрыкант»—кадушнік. У сваім хлеве ён меў схаваныя пад зямлёй дзьве кадушкі, закрытыя гноем. Гэты «фабрыкант» гр. Гузунтэрман, член мясцовага Крэдытнага Прамысловага таварыства выробляў скуру, скупаў сыравіну, абманваў сялян і утвараў сваю падпольную прадукцыю.

І вось такія „фабрыканты" не адзіныя. У Пятрыкове на базары такія „падпольнікі" прадаюць на базары сапагі па вельмі высокай цане. Як выяўлена, сапагі і іншы абутак зроблены з самадзельнай скуры на „фабрыцы" гр. Гузутэрмана і іншых такіх «фабрыкантаў».

А ў гэты час Юравіцкая шавецкая арцель прымушана прадаваць свае вырабы (сапагі, боты і інш.) на Украіну, таму, што старшыня Юравіцкага Спажывецкага Таварыства адмовіўся прыняць сапагі азначанай арцелі. А сяляне, за адсутнічаньнем гэтых, павінны зварачацца да „фабрыкантаў" і плаціць шмат даражэй.

Як Скурсындыкат перавозіць аўчыны.

Тураўскае агенцтва Скурсындыкату загатаўлівае аўчыны і па нарадах менскай канторы Скурсындыкату грузіць гэтыя аўчыны ў Калінкавічы і Гомель. Добра, агенства выконвае дырэктывы сваёй дырэкцыі, але адначасова Гомель бярэ гэтыя самыя аўчыны і... адгружае іх зноў у... Тураў у майстэрню аўчына - шубнай арцелі...

Як гэта вразумець? Чаму гэта трэба з Турава пасьлаць аўчыны ў Гомель? Можа куды лягчэй было-б, каб аўчыны, прызначаныя для адгрузкі ў Гомель, не адгружаць і тут-жа ў Тураве перадаць арцелі дзеля выпрацоўкі... Але гомельская кантора Скурсындыкату, як відаць, гэтага не разумее і траціць дзяржаўныя сродкі. Трэба РСІ зацікавіцца гэтымі махінацыямі.

Як загатаўліваюць гусей.

Загатоўка гусей у сучасны момант зьяўляецца таксама ўдарным заданьнем. Трэба забясьпечыць мясцовы рынак, трэба паставіць гусей на халадзільнікі і нарэшце неабходна выканаць экспартны плян па гусях. Але нашы загатоўча-экспартныя арганізацыі працуюць „з прахладцам". З аднаго боку ва ўсё горла крычаць: „няма гусей, цэны нізкія, немагчыма загатаўліваць", а з другога, на Мазыршчыне, у Тураўскім раёне ёсьць вялізарная колькасьць гусей, гуляюць цалымі сталмі і ніводная арганізацыя ня цікавіцца імі.

Мазырскі Дзяржгандль бел, на які ўсклалі экспартныя заданьні забясьпечаньня мясцовых рынкаў, павінен быў зацікавіцца гэтымі сталмі гусей, але яму і каапэрацыі лень заглянуць у Тураўскі раён.

За тое пасьпелі прыватныя скупнікі пазнаёміцца з гэтымі гусямі, скупаюць іх у сялян на павышанай цане і адсылаюць у іншыя мясцовасьці.

Л. Манін.

Жыве яшчэ Фэміда на Гомельшчыне

Хто вам сказаў, што з нашых судоў канчаткова выгнулі Фэміду, гэту дзябёлую жанчыну, з завязанымі вачыма? Вы мыляецеся. Калі хто хоча пазнаёміцца з гэтай старай, разбэшчанай кабетай,—можа знайсьці яе на Гомельшчыне.

— Чаму на Гомельшчыне, гэта-ж не старажытны Алімп?

— А таму, што тут ёсьць савгас Уваравічы...

Калі чытачу незразумела гэта дзіўная сувязь, дык мы паможам яму разабрацца чаму багіня правусудзьдзя буржуазнага ладу, якая скрозь пальцы глядзіць на ўсялякія шахер-махеры ў судовых справах, зьвіла сабе трывалае гняздо ў гэтай мясьціне. Ва ўсім вінаваты паўднёвы клімат Гомельшчыны, дзе людзі любяць жыць занадта шыкозна і вольна.

Пяройдзем да галоўных асоб савгасу Уваравічы, якія патрывожылі абамшэлую бойню. Вальгачоў—кіраўнік, Гольдзін—браварнік гэтага савгасу. Гэтыя людзі, якія кожны па свойму імкнуліся жыць весела, без вялікіх турбот. А там, дзе людзі ня думаюць аб булучыні, заўсёды бываюць розныя непрыемнасьці, так было і тут.

— Аднойчы ў Уваравічы прыехала рэвізійная камісія Белсельтрэсту, якая знашла, што лёзунг Вальгачова і Гольдзіна „жыві сам і дай жыць другому"—ня зусім добра адбіваецца на стане гаспадаркі

Пачнём з дробязяў. Нягледзячы на катэгарычную забарону Белсельтрэсту прадаваць прадукты прыватным асобам, кіраўнік савгасу Уваравічы гэтай дырэктывы ня выконваў. Чамусьці масла прадавалася ня Гомельскаму ЦРК, а служачым с.-г. банку.

Прынцып—„жыві сам і дай жыць другому"—сыстэматычна і пасьлядоўна праводзіўся ў жыцьцё. Езьдзілі ў камандыроўкі ў Гомель ня толькі кіраўнік і браварнік, але і больш дробныя чыны, як рахункавод, старшы рабочы ды інш. Праўда, у Гомель едуць цягніком, і амаль усе справы можна выканаць у адзін дзень, папоўніўшы выдаткі толькі за чыгуначны білет, але як, напрыклад, не застацца ў горадзе на некалькі дзён Гольдзіну, сям'я якога жыве ў горадзе? А за дні гасьцяваньня можа сплаціць савгас.

І савгас плаціў.

Сувязь з прыватнікам была самая цесная. Падрадчыкі Тарбенкаў, Ракоўскі, Гурвіч і інш. працуюць у савгасе гадамі. Ім выдаюцца авансы без гарантый, некаторыя з іх вінаваты савгасу значныя сумы грошай. Закупка бульбы даручэецца прыватнаму гандляру Вальфсону. Замест грошай савгас выдаваў яму вэксалі і плаціў процанты за вучот.

Асабліва яскрава выявіў сваю шыро кую натуру Гольдзін пры правядзеньні рамонту бровару. Для Гольдзіна гэта справа зьявілася бяздоннай крыніцай, адкуль можна было чэрпаць лёгка сотні і тысячы руб. Дзеля гэтага Гольдзін высоўвае свой праэкт на перароблку халадзільнай калёны, з устаноўкай у ёй зьмеявіка. Устаноўка зьмеявіка была зусім непатрэбнай і нямэтазгоднай. Увесь гэты рамонт каштаваў 1200 руб. Але гэтага мала. Перагонны апарат пасьля перароблкі халадзільнай калёны пачаў працаваць вельмі дрэнна, яго прышлося зноў перарабляць. Перарабілі кандэнсатар,—зноў каштавала 450 руб.

І, урэшце, калі новы браварнік Абрамаў перарабіў халадзільнік на стары лад, толькі пасьля гэтага апарат пачаў добра працаваць.

Цікава тое, што аб гэтым ведаў ядпаведны спэцыяліст Белсельтрэсту, які павінен сачыць за гэтай справай, але нічога не зрабіў.

Усю працу па рамонту бровару даручылі падрадчыку Ракоўскаму, які атрымаў ад савгасу 4120 р., звыш умовы на 1300 р. перавыдаткаў.

З прычыны няўважлівых адносін да справы, былі выпадкі крадзежу матар'ялу, фальшывае павялічэньне некаторых работ (замест 110 мэтр. драўляных труб паказана па прыёмачнаму акту 148 м.), матар'ял куплялі ў прыватніка і г. д. Ад такога гаспадараньня савгас мае страты на 7000 р. і запазычанасьці 10000 р.

Як мы адзначалі вышэй, савгас занадта пахаўрусаваў з дробна-буржуазным і кулацкім элемэнтамі. Напрыклад, у савгасе ёсьць каля 2 дзесяткаў сталых рабочых, якія маюць свае ўласныя гаспадаркі, нават некаторыя маюць па 2 каровы і па 2 коняй. Гольдзін-жа ва час службы набыў сабе ў Гомелі за 12000 р. дом.

Вось з большага малюнак тых парадкаў, якія да гэта часу існавалі ў савгасе Уваравічы.

Але зараз на сцэну зноў зьяўляецца Гомельская Фэміда. Белсельтрэст ня мог згадзіцца з такімі разбэшчанымі парадкамі ў савгасе. Справу аб Вальгачове і Гольдзіне перадалі ў суд. Гольдзін сядзеў некалькі месяцаў да суду ў папраўчым доме. Усе былі ўпэўнены, што Вальгачоў і Гольдзін, як нягодны, сапсуты элемэнт, панясуць заслужаную кару.

Як гэта вышла—мы ня ведаем, але суд апраўдаў гэтых нягоднікаў. Мала гэтага, гэтыя „пакрыўджаныя" зьбіраюцца нават патрабаваць кампэнсацыі за „прымусова-прапушчаны час".

Мы патрабуем, каб гэту справу перагледзелі нанава. Трэба рашуча выгнаць Фэміду з Гомельскіх судовых устаноў.

Працу разгортваем.

(Койданаўскі раён, Менскай акругі).

Пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці ў Койданаўскім раёне знайшло належны адбітак у працы настаўніцкай канфэрэнцыі. Прынят пункт сацыялістычнага спаборніцтва, па якім кожны настаўнік павінен навучыць дармова ня менш дзесяці няпісьменных.

Скончыліся райённыя курсы ліквідатараў, з якіх выпушчана 21 чалавек.

На пленуме райкому камсамолу дадзена заданьне ячэйцы вылучыць 50 культармейцаў на ліквідацыю няпісьменнасьці.

Праведзен вучот няпісьменных і складзены тэрытарыяльныя пляны па сельсаветах, дзе неабходна адчыніць лікпункты.

На раёну будзе працаваць 85 лікпунктаў і 15 школ маланісьменных.

Неабходна адзначыць слабую працу ячэек «Прэч няпісьменнасьць» у справе абуджэньня грамадзкай думкі навакол пытаньня зьнішчэньня няпісьменнасьці.

Ня гледзячы на шэраг хібаў у галіне працы па зьнішчэньню няпісьменнасьці, якія значна адцягнулі пачатак навучальнага году, мы ўсё-ж спадзяемся разгарнуць працу і нагнаць патрачаны час.

А. Прыемка

ФЭЛЬЕТОН

„ЗНОЙДЗЕНАЯ ЗЯМЛЯ" — ЗГУБЛЕНЫЯ ГРОШЫ.

Ох-ці мне, о-о-ох,—
На экране мох...
(Старая песьня на новы лад).

Сонечнай жніўненькай раніцой з кельлі „сьвятой Кіева-Пячэрскай лаўры" вышаў манах і пявучым голасам спытаў:

— Вы откуда, богомольцы, Собралися на поклон?

З групы веруючых адлучыўся жвавы малады хлапчына, падышоў да манаха і адказаў:

— Я Вайнштох, рэжысэр Белдзяржкіно.

Падышоў другі і таксама адрэкамандаваўся:

— Кальцаты, апэратар Белдзяржкіно.

Трэці:

— Артыст Белдзяржкіно.

Чацьверты:

— Артыст Белдзяржкіно.

Пяты:

— Артыст Белдзяржкіно.

І пашоў народ мастацтва ў Кіева-Пячэрскую лаўру. І пачаў народ мастацтва здымаць званы і званіцы, купалы і бажаніцы. І здымалі яны дзень, і два, і тры, і чатыры. І паказвалі яны на дзень пяты кіеўскім рэцэнзэнтам і крытыкам сваю мастацкую творчасьць. І славілі кіеўскія рэцэнзэнты і крытыкі рэжысэра Вайнштока: Пудоўкіным, Эйзэнштэйнам і Даўжэнкам называлі. І пачаў народ мастацтва зноў здымаць Кіева-Пячэрскую лаўру. І здымалі яны шэсьць дзён, і сем, і дзесяць, і чатырнаццаць, і дваццаць, і сорак пяць дзён здымалі яны званы і званіцы, купалы і бажаніцы. І славілі іх кіеўскія рэцэнзэнты, крытыкі і крытыканы.

І вырасьлі ў рэжысэра Вайнштока крыльлі славы. І парашыў ён паляцець над 46° 29′ паўднёвай шырыні і 30° 42′ усходняй даўжыні— у горад архітэктараў-мастакоў Далаква, Фраполі, Тарачэлі, Баффа, Марандзі,—у горад клясычных і раманскіх стыляў: абрыкосавую, вінаградную, прыморскую Адэсу. І пачаў народ мастацтва здымаць Пале-Раяль з цяністымі алеямі і фантанам, бульвары з прыгожымі дафнягладамі на сіняе мора, помнікі герцогу дэ-Рышэльё, Кацярыне II., Аляксандру II і Ф. Ф. Радзецкаму. І здымалі яны яшчэ былыя мужскія і жаночыя манастыры, царквы старабрадчаскія, грэцкія, армяна-грыгарыянскія, каталіцкія, лютэранскія, рэфармісцкія... і караімскую канэссу і яўрэйскія сінагогі здымалі яны яшчэ. Большасьць часу трупа знаходзілася к захаду ад Адэсы—у дачнай мясцовасьці марскімі купаньнямі, летнімі тэатрамі і багатымі рэстаранамі. Выяжджалі ў мора, здымалі пыркі хваль і шторм бурапенцы. Караблі і параходы, крэйсары і мінаносцы аддюстроўвалі на кінематографічнай плёнцы.

. . . . . .

— Для якой мэты здымаў рэжысэр Кіеў і Адэсу?—запытаемся мы.

— Для мастацкага паказу працоўным Беларусі грандыёзных работ на асушцы балот,—адкажа рэжысэр.

— Дзе і як?

— У новай карціне «Знойдзеная зямля».

„Знойдзеная зямля"—балоты Беларусі, у прыватнасьці Мар'інскі масыў, які асушваецца ў сучасны момант (ён займае плошчу ў 10 тысяч гэктараў). Для характарыстыкі Мар'інскіх балот падамо вытрымку з артыкулу В. Затонскага „На балотах Беларусі".

І сапраўды, на гэтым Мар'інскім балоце праведзена „эгіпецкая" работа. Ня было нямецкіх машын, дык рызыкнулі, каб ня траціць часу, найсьці ўручную. Ня лічачы больш дробных калектараў і дрэнажных канаў, пракапана пяць асноўных магістраляў. Кожная канава—звыш 20 кілёмэтраў даўжыні і 3-4 мэтраў глыбіні. На дзесяткі вёрст пракладзена па гразкім балоце дасканалае шасэ.

Мы бачылі пракладку гэтых дарог і капаньне—праца сапраўды катаржная, бо прыходзіцца далакопа адгароджваць брэзэнтам ад напору вады, або адліваць воду цэбарамі, працуючы па пояс у балоце. Але ўжо зараз 2500 гэктараў асушана.

На вялікім топкім балоце, якое ператвараецца зараз у культурны куток Беларусі, арганізуецца буйны савгас і цэлы шэраг калектываў.

Вось „Знойдзеная зямля". І карціна павінна быць аб ёй. Аб Мар'інскім масыве, цяжкай працы, торфе, электраэнэргіі, «лямпачцы Ільліча», Асінабудзе, заводах і фабрыках Беларусі, калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

І рэжысэр Вайнштох пачаў здымаць «Знойдзеную зямлю». У Гомелі патрабаваўся для карціны ўзвод чырвонаармейцаў. Але беларускія чырвонаармейцы—з

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ СТРУКТУРУ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Для пасьпяховага выкананьня задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі арганізацыйная структура і мэтады працы сельскагаспадарчай каапэрацыі, асабліва яе першапачатковыя аб'яднаньні, павінны быць прыстасаваны да задач вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі сялянскіх гаспадарак і максымальнага ўцягненьня ў каапэрацыйнае будаўніцтва сродкаў самога насельніцтва.

Пабудова сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі павінна забясьпечваць вырашэньне наступных задач:

а) шырокае разьвіцьцё, у першую чаргу на падставе кантрактацыі, масавых форм вытворчага каапэраваньня і разгортваньне будаўніцтва калектыўных гаспадарак, асабліва буйных калгасаў;

б) паглыбленьне спэцыялізацыі сыстэмы сельскагаспадарчай каапэрацыі па асноўных галінах сельскай гаспадаркі, як сапраўднейшага шляху паступовага пераходу ад каапэраваньня збыту і забясьпечэньня да аграмаджаньня вытворчасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак;

в) пашырэньне ахопу каапэраваньня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на вытворчай аснове і арганізацыя гэтых гаспадарак на аграмаджанай базе для сыстэматычнага і ўзмоцненага наступленьня на капіталістычныя элемэнты вёскі;

г) узмацненьне аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці і землякарыстаньня ў вытворчых аб'яднаньнях, арганізацыя ў іх непадзельных капіталаў, пераводу простых вытворчых аб'яднаньняў у вышэйшыя формы—калгасы;

д) шырокае разьвіцьцё самадзейнасьці і ініцыятывы ў справе каапэраваньня бядняцка-серадняцкіх мас вёскі з максымальным прыцягненьнем сродкаў самога насельніцтва для забясьпечаньня сапраўднага ўдзелу сялянства ў каапэрацыйным будаўніцтве;

е) узмацненьне ўнутрыкаапэрацыйнай дысцыпліны, увязку працы паміж усімі спэцыяльнымі сыстэмамі каапэрацыі і пасіленьне кіраўніцтва з боку дзяржаўных устаноў дзейнасьцю сельскагаспадарчай каапэрацыі, асабліва яе нізавымі зьвенямі;

ж) правядзеньне ва ўсёй працы сельскагаспадарчай каапэрацыі чоткай клясавай лініі.

Выходзячы з вышэйадзначанага, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

I. У ГАЛІНЕ АРГАНІЗАЦЫІ НІЗАВЫХ ВЫТВОРЧЫХ ЗЬВЕНЬНЯЎ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.

1. Першапачатковыя вытворчыя аб'яднаньні павінны будавацца на наступных асноўных прынцыпах:

а) масавай нізавой вытворчай ячэйкай сельскагаспадарчай каапэрацыі павінны вызвіцца адзіныя вытворчыя таварыствы спэцыяльнага напрамку ў залежнасьці ад асноўнай галіны сельскай гаспадаркі таго ці іншага райёну дзейнасьці таварыства (жывёлагадоўчая, паляводная і інш.);

б) першапачатковыя вытворчыя аб'яднаньні павінны быць з такім райёнам дзейнасьці, які-б даў магчымасьць гаспадарча ўпарадкаваць даную тэрыторыю аптымальна разьмеру з тым, каб на ёй арганізаваць сельскую гаспадарку па адзінаму вытворчаму пляну, у мэтах паступовага пераводу гэтага таварыства ў буйную калектыўную гаспадарку;

в) пасялішчныя вытворчыя таварыствы на падставе статуту маюць адпаведныя органы кіраўніцтва (праўленьне, рэвізійная камісія). Гэтыя таварыствы маюць паявы і спэцыяльны капіталы і ў сваёй працы павінны забясьпечыць намнажэньне непадзельных капіталаў;

г) задачай таварыства павінна зьявіцца: арганізацыя сельскагаспадарчай вытворчасьці на ахопліваемай таварыствам тэрыторыі ў напрамку аграмаджаньня вытворчых працэсаў сельскай гаспадаркі па адзінаму пляну, галоўным чынам на аснове кантрактацыі, а таксама арганізацыя тэрыторыі (земляўпарадкаваньне, мэліярацыя, севазварот), вытворчае крэдытаваньне, аградапамога, забясьпечаньне сродкамі вытворчасьці і арганізацыя плянавага збыту таварнай прадукцыі сваіх членаў;

д) таварыства " з самага пачатку ў сваёй дзейнасьці павінна мець у сваёй арганізацыі такія аграмаджаныя элемэнты гаспадаркі, як грамадзкі сьвіран, машынны пункт, мяльна-трапальны пункт, мачыльныя ямы, калектыўныя аборы (агульны хлеў), сілосныя ямы і г. д.;

е) пасялішчныя вытворчыя сельскагаспадарчыя таварыствы асноўнай галіны сельскай гаспадаркай павінны ўзяць на сябе функцыі арганізацыі вытворчасьці і іншых, неасноўных галін (напр, жывёлагадоўчае таварыства абслугоўвае паляводную гаспадарку), зьяўляючыся адзінай вытворчай каапэрацыйнай арганізацыяй на вёсцы.

Гэта абслугоўваньне патрэб сялянскага насельніцтва па неасноўных для данага райёну патрэб сельскагаспадарчай дзейнасьці можа рабіцца і спэцыяльнымі вытворчымі міжпасялішчнымі таварыствамі неасноўнай галіны праз заключэньне ўмоў паміж асноўнымі і неасноўнымі каапэрацыйнымі адзінкамі;

ж) у пасялішчных вытворчых таварыствах павінна быць забясьпечана поўнае і дакладнае правядзеньне пралетарска-клясавай лініі. Асобы, якія пазбаўлены права голасу паводле канстытуцыі БССР, могуць удзельнічаць у сельска-гаспадарчых каапэрацыйных арганізацыях, але не карыстаюцца ў іх правам голасу. У органы кіраўніцтва высоўваюцца батрацкая і бядняцкая-серадняцкая частка насельніцтва, дыфэрэнцыруецца абслугоўваньне паасобных сацыяльных груп сялянства, ужываюцца ў суадносінах кулацкіх гаспадарак пры правядзеньні тых ці іншых мерапрыемстваў мэтады грамадзкага прымусовага ўзьдзейнічаньня.

2. Масавымі вытворчымі асноўнымі аб'яднаньнямі прызнаць:

а) пасялішчныя паляводныя сельскагаспадарчыя вытворчыя таварыствы з спэцыяльным напрамкам (ільнаводным, бульбяным, зернавым і інш.);

б) пасялішчныя вытворчыя жывёлаводныя таварыствы з спэцыяльным напрамкам (малочным, жывёлагадоўчым, бэконным і інш.).

Побач з асноўнымі відамі пасялішчных сельскагаспадарчых вытворчых аб'яднаньняў дапускаюцьць арганізацыю спэцыяльных міжпасялішчных сельскагаспадарчых каапэратываў па неасноўных галінах сельскай вытворчасьці, як-та: садова-гародных, пчалярных, птушкаводных, мэліяратыўных таварыстваў і г. д., якія павінны весьці працу выключна ў адведных галінах сельскай гаспадаркі

II. У ГАЛІНЕ АРГАНІЗАЦЫІ РАЙЁННЫХ ВЫТВОРЧА-ЗБЫТАВЫХ І СНАБЖЭНЧАСКІХ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ.

1. Першапачатковыя вытворчыя пасялішчныя сельска-гаспадарчыя таварыствы і калгасы павінны аб'яднацца ў спэцыяльна вытворча-збытавыя і снабжэнчаскія райённыя аб'яднаньні па асноўных галінах сельскай гаспадаркі: першапачатковыя паляводныя—у райённыя паляводныя, першапачатковыя жывёлаводныя і птушкаводныя — у райённыя жывёлагадоўчыя і г. д.

2. Райённыя спэцыяльныя вытворча-збытавыя і снабжэнчаскія т-вы райёнам сваёй дзейнасьці павінны мець адміністрацыйны райён, аб'яднаць і абслугоўваць, як правіла, толькі першапачатковыя вытворчыя таварыствы адпаведнага спэцыяльнага напрамку і калгасы, з дапушчэньнем членства з фізычных асоб (ідывідуальных гаспадарак) толькі на пэрыяд рэарганізацыі сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрэцыі.

Мэліярацыйныя таварыствы на буйных масывах могуць аб'яднацца ў міжраённыя таварыствы па басэйнах рэк.

3. У задачы райённых спэцыяльных вытворча-збытавых таварыстваў павінна ўваходзіць абслугоўваньне першапачатковых вытворчых таварыстваў па лініі арганізацыі пераапрацоўкі і збыту сельскагаспадарчай прадукцыі, забясьпечаньне іх сродкамі вытворчасьці, аградапамога, інструктаваньне, кіраўніцтва і ўдзел у плянавым разьмеркаваньні вытворчых крэдытаў.

Райённыя таварыствы, мабілізуючы сродкі насельніцтва і першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў, павінны шырока разгарнуць будаўніцтва прадпрыемстваў для пераапрацоўкі, апрацоўкі і хаваньня сельскагаспадарчых прадуктаў (маслароблыя, сыраробныя, плодагародныя, льнапрацоўчыя, крухмальныя заводы, мяльна-трапальныя пункты, плодасушкі, кармушкі склады і інш.), а таксама агравытворчыя прадпрыемствы (плямянныя рассадзінкі, злучныя і машынныя пункты, трактарныя калёны, рамонтныя майстэрні і г. д.) Прадпрыемствы райённых аб'яднаньняў павінны быць рацыянальна разьмеркаваны на тэрыторыі райёну і прыстасаваны да абслугоўваньня груп пасялішчых вытворчых аб'яднаньняў, з такім разьлікам каб гэтыя прадпрыемствы, нарэшце, маглі-б зьявіцца тэхнічнай базай для масавага будаўніцтва буйных калектыўных гаспадарак.

4. У мясцох знаходжаньня дзяржаўных сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў і прадпрыемстваў іншых відаў каапэрацыі (саматужна-прамысловай, спажывецкай), раённыя таварыствы павінны ўвязаць сваю работу з гэтымі прадпрыемствамі, асабліва ў частцы забясьпечаньня іх сельска-гаспадарчым сырцом па зацьверджаных плянах і скарыстаньню іх тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

5. Першапачатковыя вытворчыя аб'яднаньні асноўнай галіны сельскай гаспадаркі зьяўляюцца членам свайго раённага таварыства, аднак, абслугоўваньне іх патрэб на неасноўных для данага раёну галінах робіцца іншымі спэцыяльнымі сыстэмамі на падставе ўмоў паміж асноўным для данага раёну відам каапэрацыі і іншымі спэцыяльнымі каапэрацыйнымі сыстэмамі без абавязковага ўваходжаньня асноўных вытворчых таварыстваў у склад членаў апошніх і без унясеньня ў гэтыя сыстэмы паявых узносаў. Гэтыя ўмовы паміж каапэратывамі заключаюцца як паміж адпаведнымі першапачатковымі каапэратывамі, гэтак і паміж вышэйстаячымі зьвенямі каапэрацыйных арганізацый. Першапачатковыя спэцыяльныя каапэратывы неасноўных галін уваходзяць членамі ў раённыя спэцыяльна вытворча-збытавыя аб'яднаньні і ня маюць права абслугоўваць асноўныя галіны гаспадаркі.

6. Усе пасялішчныя вытворчыя каапэратывы, апроч членства ў сваёй спэцыяльнай сыстэме, павінны ўваходзіць членамі ў крэдытныя таварыствы свайго раёну.

7. Калектыўныя гаспадаркі, незалежна ад членства ў калгасным сыстэме, павінны ўваходзіць членамі непасрэдна альбо праз куставыя аб'яднаньні ў раённыя крэдытныя і раённыя вытворча-збытавыя асноўныя галіны гаспадаркі раёну—таварыствы.

Абслугоўваньне патрэб калгасаў па неасноўных галінах гаспадаркі робіцца адпаведнымі раённымі таварыствамі на падставе асобных умоў з імі бяз уваходжаньня калгасаў у склад членаў памянёных таварыстваў.

III. У ГАЛІНЕ АРГАНІЗАЦЫІ АКРУГОВЫХ І РЭСПУБЛІКАНСКІХ САЮЗАЎ.

1. Сетка раённых вытворча-збытавых аб'яднаньняў павінна аб'яднацца спэцыяльнымі акруговымі і рэспубліканскімі саюзамі. Захаваць існуючыя рэспубліканскія саюзы: Белкалгассаюз і Белмажывёлсаюз і арганізаваць Беларускі паляводны рэспубліканскі саюз і Беларускі садова-гародны саюз. Мэліярацыйныя таварыствы ўваходзяць у Белкалгассаюз.

2. У задачу спэцыяльных рэспубліканскіх саюзаў уваходзіць інструктаваньне і плянаваньне работы ніжэйстаячых звеньняў адпаведнай сыстэмы, прычым пры адначасовай цэнтралізацыі і ўзмацненьні плянаваньня апэрацыйная праца павінна паступова дэцэнтралізавацца з перадачай апэрацый і фінансавых разрахункаў раённым таварыствам. Гэта дэцэнтралізацыя павінна ажыцьцяўляцца праз заключэньне генэральных умоў і разьвіцьцё транзітнага завозу ў раённыя таварыствы.

IУ. У ГАЛІНЕ СНАБЖЭНЧАСКАЙ ПРАЦЫ.

1. Снабжэньне сельска-гаспадарчымі машынамі, іншымі сродкамі вытворчасьці, мінэральнымі ўгнаеньнямі, насеньнем, сродкамі барацьбы са шкоднікамі, а таксама снабжэньне сельска-гаспадарчага каапэрацыйнага індустрыяльнага будаўніцтва—канцэнтраваць цалкам у адпаведных спэцыяльных вытворчых сыстэмах сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Снабжэньне іншымі таварамі, што ня зьвязаны з сельска-гаспадарчаю вытворчасьцю, ажыцьцяўляецца цалкам спажывецкай каапэрацыяй.

2. Каапэрацыйныя цэнтры павінны праводзіць снабжэнчаскую працу ў парадку транзітнага завозу тавараў з заводу непасрэдна ў раённыя таварыствы. У раённым цэнтры павінен быць адзін склад па снабжэньні, з якога абслугоўваюцца па спэцыяльных умовах усе спэцыяльныя сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Раённыя склады павінны належаць раённым таварыствам асноўнай галіны.

Рэспубліканскія цэнтры могуць арганізаваць праз акруговыя саюзы адзіныя склады-базы запасных частак і хаваньне некаторых запасаў сельска-гаспадарчых машын у вузлавых міжраённых цэнтрах, адкуль павінны абслугоўвацца ўсе каапэрацыйныя сыстэмы.

3. Даручыць Белсельсаюзу, Народнаму Камісарыяту Гандлю і Народнаму Камісарыяту Земляробства ў двухтыднёвы тэрмін распрацаваць палажэньне пра сыстэму снабжэнчаскай працы сельска-гаспадарчай каапэрацыі, парадку фінансаваньня і разьлікаў па гэтых апэрацыях і ўнесьці гэта палажэньне на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады.

У. У ГАЛІЕ ЗБЫТАВОЙ ПРАЦЫ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.

1. Загатоўча-збытавую працу сельскагаспадарчая каапэрацыя павінна праводзіць у асноўным праз кантрактацыю. У загатоўках незакантрактаваных прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасьці, сыстэма сельскагаспадарчай каапэрацыі ўдзельнічае разам з спажывецкаю каапэрацыяй і дзяржаўнымі загатоўчымі органамі.

2. Апэрацыя па збыту сельскагаспадарчых прадуктаў другараднага парадку (рызьзё, рогі, косьці, лекавыя травы, грыбы і інш.) і другарадны экспарт павінны праводзіцца ў асноўным спажывецкай каапэрацыяй і дзяржаўнымі загатоўчымі органамі.

3. Кантрактацыя ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі павінна праводзіцца першапачатковымі пасялішчнымі спэцыяльнымі вытворчымі аб'яднаньнямі па плянах вышэйстаячых зьвеньняў каапэрацыйнай сыстэмы.

Кожная заключаная ўмова паміж першапачатковым аб'яднаньнем і раённым таварыствам перш за ўсе павінна зьявіцца арганізацыйна-гаспадарчым плянам кожнага пасялішчнага вытворчага аб'яднаньня па перабудове і ўздыму сялянскіх гаспадарак. Адначасова з гэтым кантрактацыя ў індывідуальных гаспадарках, правадзімая непасрэдна раённымі таварыствамі, павінна быць у максымальай ступені абмежавана і паступова скарачацца праз павялічэньне гэтай працы першапачатковымі вытворчымі таварыствамі. Раённыя вытворча-збытавыя таварыствы асноўнай галіны сельскай гаспадаркі павінны таксама ўжываць шырокую практыку заключэньня ўмоў па кантрактацыі з спэцыяльнымі аб'яднаньнямі неасноўных галін.

4. Даручыць Белсельсаюзу і Народнаму Камісарыяту Гандлю ў 2-х тыднёвы тэрмін распрацаваць палажэньне пра загатоўчую працу сельскагаспадарчай каапэрацыі і пра парадак авансаваньня і кантрактацыі і падаць гэта палажэньне на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады.

VI. У ГАЛІНЕ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА КРЭДЫТАВАНЬНЯ.

1. Усе існуючыя сельскагаспадарчыя крэдытныя таварыствы павінны быць аб'яднаны і рэарганізаваны ў райённыя крэдытныя таварыствы, з перадачай снабжэнчаска-збытавых функцый адпаведным райённым вытворча-збытавым таварыствам. Сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы перадаюць у райённыя вытворча-збытавыя таварыствы адпаведную частку капіталаў, а таксама адпаведныя склады, базы і прадпрыёмствы.

Сельскагаспадарчыя крэдытныя таварыствы, якія знаходзяцца ў значнай адлегласьці ад райённага цэнтру пасьля ўтварэньня ў райёне крэдытных райённых таварыстваў, паступова рэарганізуюцца ў першапачатковыя вытворчыя аб'яднаньні з спэцыяльным ухілам у залежнасьці ад асноўнай галіны сельскай гаспадаркі для данага райёну.

2. Райённыя крэдытныя таварыствы ўключаюць у склад сваіх членаў калгасы, усе першапачатковыя сельскагаспадарчыя вытворчыя аб'яднаньні, а таксама і тыя бядняцка-серадняцкія індывідуальныя сялянскія гаспадаркі, якія яшчэ некаапэраваны першапачатковымі вытворчымі аб'яднаньнямі.

3. У задачу райённых сельскагаспадарчых крэдытных таварыстваў павінна ўваходзіць:

а) мабілізацыя сродкаў насельніцтва і каапэрацыйных арганізацый (уклады, бягучыя рахункі і фондавыя апэрацыі);

б) крэдытаваньне першапачатковых аб'яднаньняў, калгасаў і бядняцка-серадняцкіх індывідуальных гаспадарак па пляну вышэйстаячых каапэрацыйных зьвеньняў;

в) выкананьне функцый нізавой разьліковай касы;

г) кантроль над грашовай дзейнасьцю першапачатковых вытворчых каапэратываў;

д) грашовае абслугоўваньне тавараазвароту;

е) выкананьне даручэньняў фінансавых устаноў.

4. Надаць першапачатковым пасялішчным вытворчым каапэратывам права вытворчага крэдытаваньня і зрабіць іх адказнымі перад райённымі крэдытнымі таварыствамі за правільнае накіраваньне і скарыстаньне і своечасовы зварот атрыманых крэдытаў.

5. Крэдытаваньне павінна праводзіцца райённымі крэдытнымі таварыствамі, як правіла, праз нізавую сетку першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў сыстэмы сельска-гаспадарчэй каапэрацыі па плянах адпаведнай спэцыяльнай сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі і па ўмовах апошніх з банкамі.

6. Райённыя сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы ўваходзяць членамі акцыянэрамі ў Беларускі Сельска-Гаспадарчы Банк.

VII. У ГАЛІНЕ КАПІТАЛАНАКАПЛЕНЬНЯ.

1. Ува ўсіх першапачатковых каапэрацыйных аб'яднаньнях устанавіць сталыя ўступныя паявыя ўзносы і штогоднія ўзносы ў спэцыяльныя непадзельныя капіталы.

2. Паявыя ўзносы для членаў, якія ўваходзяць у першапачатковыя вытворчыя сельска-гаспадарчыя аб'яднаньні і ў райённыя спэцыяльныя вытворча-бытавыя таварыствы, а таксама ў райённыя сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы, вызначаюцца ў наступных дыфэрэнцыраваных для паасобных сацыяльна-клясавых груп насельніцтва разьмерах: 5 руб. для батракоў, 10 руб. для гаспадарак аслабленых ад сельска-гаспадарчага падатку і 25 руб. для гаспадарак, якія плацяць сельска-гаспадарчы падатак,

Для гаспадарак, якія плацяць сельска-гаспадарчы падатак у індывідуальным парадку, разьмер паю вызначаецца ў 50 р., прычым гэты пай можа быць нізавымі каапэрацыйнымі аб'яднаньнямі, а таксама іх акруговымі і рэспубліканскімі саюзамі павялічан у два і больш разы.

3. Уступны ўзнос ва ўсіх сельска-гаспадарчых вытворчых аб'яднаньнях вызначаецца ў разьмеры 5 проц. ад дыфэрэнцыраванага паявога ўносу і ўплачваецца пры ўваходжаньні ў члены аб'яднаньня і залічваецца ў непадзельны капітал гэтага аб'яднаньня.

Разьмер штогодніх узносаў ад членаў спэцыяльных пасялішчных вытворчых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў у спэцыяльныя непадзельныя капіталы, прызначаемыя на агравытворчую працу, і індустрыялізацыю і інш. спэцыяльныя патрэбы, устанаўляецца, у залежнасьці ад гаспадарчай моцнасьці кожнай сялянскай гаспадаркі, агульным сходам, на падставе дырэктывы вышэйстаячых зьвеньняў сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

5. Кожны член, як правіла, уносіць толькі адзін паявы ўзнос у асноўны першапачатковы пасялішчны вытворчы сельскагаспадарчы каапэратыў, па асноўнай галіне сельскай гаспадаркі для данага райёну. Членства ў даным каапэратыве дае права сельскім гаспадаркам, уваходзячым у яе, на атрыманьне гаспадарчага абслугоўваньня з боку ўсіх іншых вытворчых каапэратываў па неасноўных галінах, з уплатаю толькі ўступнага ўзносу і ўстаноўленых штогодніх спэцыяльных узносаў у непадзельны капітал, паводле статуту гэтых каапэратываў.

6. Для беднаты і батракоў растэрмінаваньне паявых узносаў дапушчаецца да 3-х год, у дачыненьні серадняцкіх гаспадарак растэрмінаваньне можа быць дапушчана толькі па індывідуальнаму падыходу да кожнага члена паасобку.

7. Паявыя ўзносы першапачатковага вытворчага сельска-гаспадарчага аб'яднаньня ў вышэйстаячае зьвяно (райённае вытворча-збытавое сельска-гаспадарчае таварыства) і ў крэдытныя таварыствы не павінны правышаць 40 проц. ад паявых узносаў, сабраных першапачатковым аб'яднаньнем.

8. Райённыя вытворча-збытавыя таварыствы ўносяць пай у саюз, куды яны непасрэдна ўваходзяць членамі, у разьмеры ня звыш 25 проц. сабраных імі паявых капіталаў.

9. Камітэты сялянскай узаемадапамогі, пры ўваходжаньні ў склад членаў сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў, уносяць адзін бядняцкі пай (10 руб.) на кожныя 100 сваіх членаў, але ня звыш 10 паёў. У адносінах усіх астатніх юрыдычных асоб, уваходзячых у сыстэму крэдытных таварыстваў, разьмер паю ўстанаўляецца праз процантныя адлічэньні з паявога капіталу гэтых арганізацый па пастанове савету прымаючага крэдытнага таварыства.

10. Уступныя ўзносы першапачатковага вытворчага пасялішчнага сельска-гаспадарчага аб'яднаньня ў вышэйстаячыя таварыствы (райённае вытворча-збытавое сельска-гаспадарчае таварыства ці крэдытнае таварыства) вызначаюцца ў разьмерах 25 проц. ад уступных узносаў, сабраных першапачатковымі каапэратывамі.

11. Уступныя і паявыя ўзносы для калектыўных гаспадарак, якія ўваходзяць у якасьці юрыдычных асоб у асноўныя райённыя вытворча-збытавыя сельска-гаспадарчыя таварыствы і крэдытныя таварыствы, вызначаюцца ў разьмерах 20 пр. ад статутнага бядняцкага паю за кожнага фізычнага члена калгасу, але ўсяго ня звыш 250 рублёў. Уступныя ўзносы вызначаюцца ў разьмеры 20 проц. ад дыфэрэнцыраванага бядняцкага ўступнага ўзносу ад кожнага фізычнага члена калгасу. У неасноўныя спэцыяльныя вытворча-збытавыя райённыя таварыствы калгасы паю ня ўносяць, а толькі ўступныя ўзносы ў тым-жа разьмеры як і ў асноўныя віды.

У выпадку адсутнасьці ў адміністрацыйным райёне вытворча - збытавога сельскагаспадарчага таварыства спэцыяльнага напрамку, адпавядаючага інтарэсам і патрэбам калектыўнай гаспадаркі, абслугоўваньне апошняй па гэтай спэцыяльнай галіне павінна ўзяць на сябе райённае вытворча-збытавое таварыства асноўнага віду па асобнай спэцыяльнай умове.

12. Паявыя ўзносы ліквідуемых ці рэарганізуемых першапачатковых спэцыяльных вытворчых сельскагаспадарчых аб'яднаньняў перадаюцца ў тыя вытворчыя аб'яднаньні, куды ўступае сялянская гаспадарка, якая ўнесла пай у ліквідуемае ці рэарганізуемае таварыства.

Калі сялянская гаспадарка ліквідаванага ці рэарганізаванага першапачатковага спэцыяльнага вытворчага аб'яднаньня ўступае членам у некалькі вытворчых каапэратываў, паявы ўзнос перадаецца ў той каапэратыў, які будзе лічыцца асноўным відам для данага райёну.

13. Непадзельныя капіталы ліквідуемых ці рэарганізуемых першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў перадаюцца цалкам нанова арганізаваным у данай мясцовасьці пасялішчным каапэратывам прапарцыянальна колькасьці членаў, пераведзеных ад астатніх таварыстваў.

VIII. ПАРАДАК І ШЛЯХІ РЭАРГАНІЗАЦЫІ СЫСТЭМЫ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.

1. Даручыць Белсельсаюзу, Белсельбанку і Народнаму Камісарыяту Земляробства на працягу месяца распрацаваць каляндарны плян і парадак рэарганізацыі існуючай сыстэмы сельскагаспадарчай каапэрацыі на падставе гэтай пастановы і падаць на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады.

2. Гэта рэарганізацыя павінна быць праведзена пры захаваньні наступных палажэньняў:

а) улічваюцца асаблівасьці паасобных райёнаў у натуральных і эканамічных адносінах;

б) узмацненьня і пашырэньня ўсіх спэцыяльных сыстэм сельскагаспадарчай каапэрацыі па асноўных галінах сельскай гаспадаркі;

в) поўнага захаваньня бесперабойнасьці ў рабоце сельскагаспадарчай каапэрацыі;

г) рэарганізацыя сыстэмы павінна быць праведзена ў першую чаргу нізавой сеткі і ў другую чаргу райённых акруговых і рэспубліканскі зьвеньняў.

У сувязі з тым, што рэарганізацыя сыстэмы сельскагаспадарчай каапэрацыі патрабуе прыцягненьня новых кадраў, асабліва ў нізавыя зьвеньні, даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з Белсельсаюзам і Народным Камісарыятам Фінансаў на працягу двух тыдняў распрацаваць мерапрыемствы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы каапэрацыйных кадраў.

4. Даручыць Белсельсаюзу на працягу 2-х месяцаў пераапрацаваць статуты ўсіх відаў і зьвеньняў сыстэмы сельскагаспадарчай каапэрацыі ў адпаведнасьці з гэтай пастановай і падаць іх на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады.

5. Рэарганізацыю сыстэмы сельскагаспадарчай каапэрацыі адпаведна гэтай пастанове пачаць з 1-X—29 г. і ў асноўным скончыць да 1-X—30 г.

6. Пры правядзеньні рэарганізацыі ўсёй сыстэмы сельскагаспадарчай каапэрацыі абавязковай умовай павінна быць поўная ўзгодненасьць і адзінства дзейнічаньня ўсіх спэцыяльных сыстэм сельскагаспадарчай каапэрацыі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР
Л. ДУБАВІЦКІ.

4 верасьня 1929 г.,
г. Менск.

Дырэктывы ня выконваюцца.

(Менская аб'яднаная прафтэхшкола).

Пастановы як партыі, так і іншых нашых органаў натрабуюць рашучага правядзеньня беларусізацыі, але ў Менскай аб'яднанай прафтэхшколе ня робіцца рашучых крокаў дзеля пераходу на выкладаньне на беларускай мове.

У школе ёсьць настаўнікі, якія манкіруюць беларускую мову, напрыклад: настаўнік бухгальтэрыі сам ведае беларускую мову, на лекцыях розныя схэмы на дошцы піша на беларускай мове, а растлумачвае на расейскай. Вучань пытае на беларускай мове, а настаўнік адказвае на расейскай.

Другія факты: ёсьць настаўнікі, якія па некалькі год працуюць у школе, а калі запытаеш, чаму вы ня хочаце вывучаць беларускую мову, дык яны адказваюць:

— «Навошта мне вывучаць беларускую мову, калі ў вашай школе я маю 8-10 лекцый і за гэтыя лекцыі буду вывучаць?..» Праўда, гэта спэцыялісты і выкладчыкі спэцыяльных прадметаў (тэхналёгія, чарчэньне, машынаназнаўства), але трэба перад імі паставіць рашуча пытаньне, калі наша школа беларуская, дык павінны яны прыстасоўвацца да школы, я ня школа да настаўнікаў.

Праўда, калі мы будзем выносіць такія прапановы, якія выносіць і школьны савет па пытаньню беларусізацыі:—«старацца да пераходу на беларускую мову...», старацца можна месяц, год і болей, а гэта вельмі адбіваецца на вучнёўскай масе. Беларусізацыя ў сямігодках у сучасны момант ужо пастаўлена добра і калі вучань прыбывае ў прафтэхшколу, ён яе забывае, гутаркі ўсе вядуцца на расейскай мове. Калі вучань пытаецца па беларуску, настаўнік, або інструктар адказваюць на расейскай. Гэта становішча нікуды ня годнае, ужо пара выканаць дырэктыву партыі.

Партыйная ячэйка, якая ёсьць, ніяк не рэагуе на такія зьявішчы і рашучых крокаў ня прымае.

Дрэнна справа абстаіць і з яўрэйскай сэкцыяй, якая ёсьць пры школе. У гэтым годзе з васьмі прадметаў выкладаецца на яўрэйскай мове толькі родная мова, якую ўжо нельга выкладаць на іншай мове, і матыматыка, а астатнія прадметы выкладаюцца і на расейскай і на беларускай мовах. А патрэбна заўважыць, што на яўрэйскай сэкцыі амаль усе на 95 проц. вучні, якія скончылі яўрэйскія сямігодкі, якім цяжка працаваць не на роднай мове.

А.

„Сав. Беларусь" дапамагла.

ВІНАВАТЫЯ ПАНЯСУЦЬ АДКАЗНАСЬЦЬ.

„Савецкая Беларусь" у № 78 сыгналізавала аб нядбайнасьцях, якія мелі месца пры пабудове кішачнага заводу, хала дзільніка і інш. На сыгнал „Савецкай Беларусі" адгукнуліся рабочыя брыгады і РСІ, якія расьледзвалі гэту справу.

Пашыранае пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў, якое адбылося ў памяшканьні кішачнага заводу, пастанавіла, што газэта „Савецкая Беларусь" сыгналізавала правільна, што факты, адзначаныя ў газэце, мелі месца на заводзе; пастаноўлена прасіць пракурора Менакругі ў тэрміновым парадку прыцягнуць да судовай адказнасьці службовых асоб Менсельпрому і жывёлабойні—за дрэнная вядзеньне гаспадаркі і за бязьдзейнасьць. Апроч гэтага, пастаноўлена прыцягнуць да адказнасьці асоб, якія складалі няправільны праэкт пабудовы кішачнага заводу і асоб тэхнічнага нагляду Гандльбуду і Менсельпраму.

ВЫДАЛЕН З ТЭХНІКУМУ.

У допісе „Патрэбна пралетарская мятла" аўтар паведамляў, што студэнт Мельнікаў, будучы ў часе летніх вакацый быў загадчыкам дзіцячай пляцоўкі ў Сьмілавіцкім сельсавеце, абакраўся і ўцёк, а разам з тым украў 15 рублёў, якія былі сабраны на пабудову самалёту імя газэты „Савецкая Беларусь".

Гомельскі Белпэдтэхнікум, разгледзеўшы гэту справу, выдаліў Мельнікава з шэрагаў студэнтаў тэхнікуму.

ЗА ЗАМАХ НА ЖЫЦЬЦЁ СЕЛЬКОРА

30-га верасьня бягучага году ў рэдакцыю быў дасланы допіс—„Замах на забойства селькора Саўчы". Гэты допіс рэдакцыя накіравала ў менскую акруговую пракуратуру. Рассьледваньнем устаноўлена, што факты, прыведзеныя ў допісе у асноўным пацьвердзіліся: Менскі Акруговы Суд прыгаварыў хуліганаў Цярэшка, Качуру і Шкатулу да пазбаўленьня волі на тэрміны ад 4-хда 2-х год.

***

Па допісу „Забытыя людзі" раённая зямельная частка Пухавіцкага райёну дае наступнае тлумачэньне: Цыганом пас. „Чырвоны Табар" у часе пасеўкампаніі была аказана дапамога, усе цыганы былі забясьпечаны насеньнем праз сялянскі камітэт узаемадапамогі, былі каапэраваны ў сельска гаспадарчых крэдытных таварыствах.

Усяго табару выдана крэдыту на 2615 рублёў і 60 кап.

***

Допіс „Вось наляцеў, аж сам ня рад" рассьледваньнем поўнасьцю пацьвердзіўся. Пастаўлена пытаньне аб зьняцьці віноўнае асобы з працы, бо ні вымовы, ні папярэджаньні на яго не рабілі ўпыву.

ХРОНІКА.

Тав. Галадзед вярнуўся з камандыроўкі.

Старшыня СНК БССР т. Галадзед вярнуўся з камандыроўкі з Масквы і прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў.

Арганізацыя буйных ільнаводных гаспадарак.

У сучасны момант у Наркамземе распрацоўваецца пытаньне аб арганізацыі ў БССР буйных ільнаводных і канапляводных гаспадарак. У савгасе на Мар'інскім балотным масыве мяркуюць арганізаваць выключна канапляводную гаспадарку. Зараз праводзіцца падшуканьне месца для арганізацыі буйнага савгасу, ня менш, як у 5000 гэктараў пад ільнаводны савгас. Такі савгас мяркуецца арганізаваць у Полацкай акрузе. Апроч гэтага, маюць быць заснаваны некалькі буйных ільнаводных калгасаў, ня менш, як па 7000 гэкт.

З вясны маюць пачацца арганізацыйныя работы па стварэньню гэтых гаспадарак.

Загатоўка малочных прадуктаў.

Прэзыдыум Дзяржпляну згадзіўся з пастановай Наркамгандлю аб загатоўцы малочных прадуктаў для БССР. Малака будзе загатоўлена 20800 тон, масла 2127 тон і сыру 1030 тон.

Вылучаем на адказную працу.

ЦП Саюзу Камунальнікаў вылучыла на адказную працу т. т. Ліманскага, Куцмана і Маркоўскага.

Апавяшчэньні.

УСІМ АК І РК КП(б)Б.

Завочныя курсы па павышэньню тэарэтычнай кваліфікацыі партактыву пры Камуніверсытэце Беларусі імя У. І. Леніна паведамляюць, што 23-X г. г. курсамі разасланы па ўсіх РК і АК КП(б)Б асабовыя карткі і матар'ялы для ўсіх паступаючых на курсы.

Просім паскорыць укамплектаваньне курсаў.

Загадчык Завочнымі Курсамі
Партактыву пры КУБ імя
У. І.